WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 КРАСАВІКА 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 60
(26924)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

НА ВЫХАДНЫЯ ІСТОТНА ПАЦЯПЛЕЕ

Сёння ўдзень дажджліва, а тэмпература 4—11, па поўдні — да 14 цяпла, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ. У суботу ўначы паўсюдна, а ўдзень месцамі дождж. Уначы 0—7 цяпла, удзень — 7—14, на поўдні — да плюс 17 градусаў. У нядзелю уначы плюс 1—7, удзень — 12—17, у Брэсцкай вобласці — 18—20 цяпла. У першыя дні наступнага тыдня уначы плюс 1—8, удзень 13—18, па поўдні да 20 цяпла. Сапраўдная цеплыня ўсталюецца ў нас надоўга.

Сяргей КУРКАЧ.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАРУЧЫЎ АЖЫЦЦЯВІЦЬ КАНКРЭТНЫЯ ЗАХАДЫ ПА ПАДТРЫМЦЫ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 31 сакавіка прыняў з дакладам міністра адукацыі Беларусі Сяргея Маскевіча, які далажыў Прэзідэнту аб асноўных напрамках у развіцці вышэйшай адукацыі, выкананні даручэнняў, дадзеных пры назначэнні на гэту пасаду. На сустрэчы таксама прысутнічаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Тэма развіцця вышэйшай адукацыі ў Беларусі становіцца асабліва актуальнай з улікам прынятых рашэнняў па інтэнсіўным інавацыйным развіцці краіны. Своеасаблівым лакаматывам у гэтым пытанні павінны стаць у тым ліку і ВНУ. «Давайце абмяркуем увесь комплекс пытанняў, і калі ў нас акрэсліцца нейкія напрамкі ўдасканалення вышэйшай школы, то сёння ж трэба прымаць рашэнні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на платную адукацыю, даручыўшы ўважліва вывучыць працэс фарміравання цэн на адукацыйныя паслугі, каб у гэтай сферы ўсё рабілася абгрунтавана, а спагнанне платы ажыццяўлялася пры строгім выкананні заключаных дагавораў. «Як ні дзіўна, мне паступае інфармацыя аб тым (я не сцвярджаю, што гэта так, але тым не менш дыму без агню не бывае), што нашы рэктары пачынаюць у гэтым напрамку разбойнічаць», — адзначыў Прэзідэнт, растлумачыўшы, што часам, напрыклад, без дастатковых падстаў уводзіцца дадатковая плата за тыя ці іншыя паслугі. Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў распрацаваць спецыяльныя мерапрыемствы і ажыццявіць канкрэтныя захады па падтрымцы маладых вучоных, прыцягваць у навуковую і адукацыйную дзейнасць найбольш адораных і таленавітых маладых людзей.

Як далажыў Сяргей Маскевіч, у ВНУ плануецца стварыць асяроддзе, спрыяльнае для прафесійнага росту моладзі, будуць актыўна стварацца студэнцкія бізнэс-інкубатары. Больш цесным стане ўзаемадзеянне ВНУ з рэальным сектарам эканомікі, навуковымі ўстановамі. Гэта тэма будзе таксама абмяркоўвацца на адным з бліжэйшых пасяджэнняў Прэзідыума Савета Міністраў. У прыватнасці, ёсць прапановы па стварэнні холдынгаў або вучэбна-навукова-вытворчых цэнтраў у складзе ВНУ, навуковых установ, вытворчых структур. Гэта значыць плануецца прымаць розныя меры для таго, каб кардынальна палепшыць практычную падрыхтоўку студэнтаў да вытворчай дзейнасці. Міністр адукацыі таксама праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, што пазітыўныя водгукі выклікаюць вырашаныя пытанні з харчаваннем дзяцей у школах і дашкольных установах, праезду вучняў у грамадскім транспарце. «Усё гэта добра, вядома, і гэта не павінна выглядаць неяк утрыманскі з боку нашых бацькоў, выкладчыкаў, навучэнцаў і г.д., — адзначыў беларускі лідар. — Карміць дзяцей трэба, і мы будзем іх карміць. Таму што не ў кожнай сям'і дзеці нармальна могуць харчавацца. Што датычыцца праезду — разбагацеем, тады кожны будзе плаціць за гэты праезд сам».

Акрамя таго, было адзначана праведзенае не так даўно павышэнне зарплат педагогаў. «Вядома, нам нялёгка далося гэта павышэнне зарплаты. Перажывём, грамадства перажыве гэта. Таму што настаўнік, урач беднымі быць не павінны, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Цяпер трэба значна павялічыць узровень адукацыі ў школе і патрабаванне, нават паставіць на ўзровень савецкіх часоў, калі самае строгае патрабаванне было з вучняў, бацькоў за адукацыю і выхаванне дзяцей у школе. І вось гэта — галоўная задача. Больш мы нічога не патрабуем ад настаўнікаў. Цяпер мы чакаем нанясення галоўнага «ўдару» па асноўным напрамку: адукацыя, выхаванне і павелічэнне вось гэтага патрабавання з вучняў і бацькоў. І ўсё, што трэба для гэтага (нарматыўна, арганізацыйна), — усё трэба зрабіць». Дарэчы, некаторыя меры ў гэтым напрамку прадугледжаны Кодэксам аб адукацыі, які ўступіць у сілу з 1 верасня 2011 года.

БЕЛАРУСЬ УЗМАЦНЯЕ БЮДЖЭТНУЮ І ГРАШОВА-КРЭДЫТНУЮ ПАЛІТЫКУ

Урад і Нацыянальны банк Беларусі рэалізуюць меры эканамічнай палітыкі, накіраваныя на абмежаванне сукупнага ўнутранага попыту і забеспячэнне збалансаванага развіцця эканомікі. З боку Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь узмоцнена грашова-крэдытная палітыка шляхам выкарыстання для гэтага наяўных у яго інструментаў. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве фінансаў Беларусі.

У Мінфіне растлумачылі, што ў сувязі са зніжэннем суверэнных крэдытных рэйтынгаў Рэспублікі Беларусь ад замежных інвестараў, асноўных замежных гандлёвых партнёраў паступаюць пытанні адносна эканамічнай палітыкі, рэалізуемай урадам Беларусі і Нацыянальным банкам.

Як адзначылі ў Мінфіне, урад Беларусі праводзіць работу па зніжэнні дэфіцыту бюджэту сектара органаў дзяржаўнага кіравання з 3 працэнтаў да 1,5 працэнта да ВУП. Гэта плануецца дасягнуць шляхам павелічэння даходаў бюджэту праз павышэнне ролі прадпрыемстваў сыравінных галін у фарміраванні даходаў без змянення ўзроўню падатковай нагрузкі на эканоміку краіны ў цэлым, а таксама аптымізацыяй і абмежаваннем расходаў бюджэтных арганізацый і аб'ёмаў дзяржаўных інвестыцый.

Плануемыя абмежаванні не закранаюць расходы на абслугоўванне і пагашэнне дзяржаўнага доўгу. Названыя плацяжы забяспечаны ў поўным аб'ёме асігнаваннямі рэспубліканскага бюджэту і валютнымі рэзервамі на рахунках Міністэрства фінансаў. У адпаведнасці з артыкулам 57 Бюджэтнага кодэкса плацяжы па абслугоўванні і пагашэнні дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца першачарговымі адносна іншых плацяжоў пры выкананні рэспубліканскага бюджэту. У лютым-сакавіку гэтага года Беларусь у поўным аб'ёме і ў тэрмін ажыццявіла плацяжы па знешнім доўгу, у тым ліку выплаціла першы купон па суверэнных еўрааблігацыях, а таксама аблігацыях, размешчаных на рынку Расійскай Федэрацыі.

Пачынаючы са студзеня 2011 года, Міністэрства фінансаў рэалізуе жорсткую бюджэтную палітыку. У выніку за студзень-люты 2011 года прафіцыт бюджэту сектара дзяржаўнага кіравання (уключае ў сябе рэспубліканскі бюджэт, мясцовыя бюджэты і бюджэт Фонду сацыяльнай аховы насельніцтва) склаў Br0,4 трлн (1,6 працэнта да ВУП). Дасягнутая дынаміка будзе захавана і па выніках I квартала гэтага года.

У мэтах забеспячэння макрафінансавай збалансаванасці ў 2011 годзе ўрад актывізаваў работу па рэалізацыі сваіх планаў прыцягнення прамых замежных інвестыцый, у тым ліку шляхам прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці. Для падтрымання плацежнага балансу ва ўстойлівым стане ўрад Беларусі звярнуўся да Расійскай Федэрацыі і антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС за прадастаўленнем стабілізацыйных крэдытаў на агульную суму $3 млрд. Міністэрства фінансаў Беларусі цяпер знаходзіцца ў актыўнай фазе перагавораў з Міністэрствам фінансаў Расіі, завяршыць якія бакі плануюць у бліжэйшы час.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінская школьніца Вераніка Ігнатовіч корміць гарадскіх галубоў.

КРЫЛАТЫЯ ШАЛІ

НАЦБАНК: ДАДАТКОВЫХ АБМЕЖАВАННЯЎ НЕ БУДЗЕ

Праўленнем Нацыянальнага банка Беларусі, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч, прынята рашэнне не прымяняць дадатковых абмежавальных захадаў у сферы валютнага рэгулявання і валютнага кантролю.

У Нацбанку зазначаюць, што прынятыя з пачатку года ў згаданай сферы захады былі накіраваныя на захаванне і павелічэнне золатавалютных рэзерваў, а таксама стварэнне ўмоў для стымулявання экспартнай дзейнасці прадпрыемстваў. Акрамя таго, у галоўным банку падкрэсліваюць, што абмежавальныя захады носяць паслядоўны і часовы характар. Што датычыцца золатавалютных рэзерваў, то ўжо сёлета для забеспячэння эканамічнай бяспекі краіны іх узровень неабходна нарасціць у эквіваленце да 9-10 мільярдаў долараў ЗША. Таму, у прыватнасці, 25 лютага і было прынята рашэнне, якое абмяжоўвала набыццё імпартнага абсталявання за кошт валюты, якую купляюць; 14 сакавіка — аб увядзенні 30-дзённага рэзервавання сродкаў для куплі валюты на біржы і аб падмацаванні камерцыйных банкаў на міжбанкаўскім рынку для продажу валюты насельніцтву; 21 сакавіка — аб спыненні падмацавання камерцыйных банкаў для продажу валюты насельніцтву; 22 сакавіка — аб тым, што рэзервaванне банкамі сродкаў на куплю валюты будзе ажыццяўляцца ў ранейшым рэжыме (за адзін дзень да правядзення таргоў), і інш. Акрамя таго, Нацбанкам таксама рэалізаваныя неабходныя захады па ўзмацненні жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі, у тым ліку ў галіне курсавой, працэнтнай і эмісійнай палітыкі, абавязковага рэзервавання.

«Усе рашэнні, — заяўляюць у Нацыянальным банку, — неабходныя для захавання і нарошчвання золатавалютных рэзерваў, цяпер прынятыя».

Адначасова праводзіцца работа па прыцягненні дзяржаўных крэдытных рэсурсаў ад Расіі і Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, а таксама вядуцца перагаворы з буйнымі замежнымі інвестарамі аб рэалізацыі шэрагу інвестыцыйных праектаў.

Таксама ў Нацыянальным банку адзначаюць, што па меры нарошчвання золатавалютных рэзерваў неабходнасць у раней уведзеных захадах рэгулявання аперацый куплі-продажу замежнай валюты адпадзе, і Нацбанк зробіць крокі па ўзмацненні рыначных механізмаў функцыянавання валютнага рынку.

Ігар ГРЫШЫН.

Пріорбанк названы лепшым банкам па аказанні паслуг прадпрымальнікам у 2010 годзе

Пріорбанк стаў лаўрэатам конкурсу «Лепшы прадпрымальнік г. Мінска» ў намінацыі «Лепшы банк па аказанні паслуг прадпрымальнікам у 2010 годзе». Ва ўрачыстай абстаноўцы старшыня Мінскага гарвыканкама Мікалай Ладуцька ўзнагародзіў члена Праўлення «Пріорбанк» ААТ Сяргея Шышова ганаровым дыпломам.

Конкурс «Лепшы прадпрымальнік года Мінска» праводзіцца штогод. Удзельнічаць у ім могуць юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія працуюць у розных сферах, а таксама фінансавыя ўстановы, зарэгістраваныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Крытэрыем служаць вынікі фінансава-гаспадарчай дзейнасці за мінулы каляндарны тэрмін. Традыцыйна на конкурсе «Лепшы прадпрымальнік 2010 года» быў шырока прадстаўлены банкаўскі бізнэс.

Супрацоўнікі банка Максім Лук'яновіч, Мая Мяцельская, Сяргей Шышоў.

«У рамках вялікай канкурэнцыі на банкаўскім рынку якасць абслугоўвання аказвае істотны ўплыў на выбар прадпрымальнікам таго ці іншага банка, — сказаў Сяргей Шышоў. — У адносінах з кліентамі мы прыкладаем максімум намаганняў, каб адпавядаць іх патрабаванням, стараемся быць найбольш эфектыўнымі і гібкімі. Мы імкнёмся да таго, каб кліент, выбраўшы наш банк аднойчы, застаўся верным свайму выбару назаўсёды».

БЕНЗІН ЗНОЎ ПАДАРАЖЭЎ

30 сакавіка на аўтазапраўках назіраўся ажыятажны попыт на паліва: аўтааматары спяшаліся напоўніць бензабакі па старых цэнах.

Людская пагалоска, як высветлілася, спраўдзілася: канцэрн «Белнафтахім» учора паведаміў, што з гэтай пятніцы змяняюцца рознічныя цэны на нафтапрадукты, што рэалізуюцца праз аўтазаправачныя станцыі, — яны павысіліся на 10 працэнтаў. Нагадаем, што павышэнне цэн на паліва было праведзена ў мінулым месяцы 3 і 31 сакавіка. Такім чынам, цяпер рознічная цана за 1 літр бензіну Нармаль-80 складае 3 150 рублёў, за 1 літр бензіну AI-92 давядзецца выкласці 3 300 рублёў, бензіну AI-95 — 3 750 рублёў, бензіну AI-95-Еўра — 3 750 рублёў, а літр дызельнага паліва каштуе 3 150 рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК:

«Дрэнных спецыялістаў не бывае»

— Наколькі ўтульна Вы адчуваеце сябе ў губернатарскім крэсле? Такім было адно з пытанняў на прэс-канферэнцыі, якую ўпершыню ў новай для сябе якасці даў старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік. У пачатку красавіка будзе якраз 100 дзён, як новы кіраўнік заняў гэтую пасаду. Уладзімір Андрэевіч адказаў, што пакуль не лічыць, што адаптацыя завяршылася, таму што праблем вельмі шмат, ды і рэгіён вялікі.

— Але ж я тут нарадзіўся, жыў і працаваў. Вядома, многа для мяне новага, але ж будзем імкнуцца працаваць так, каб не было соромна за сябе. Вы ведаеце, што зараз змяніліся крытэрыі падыходу да эканомікі. Цяпер з'явіўся новы паказчык: валавы рэгіянальны прадукт. Калі ў мінулыя гады мы ацэньвалі ўзровень працы па аб'ёмных паказчыках, то сёння ацэнка — па эфектыўнасці. Па выніках двух месяцаў рост валавога рэгіянальнага прадукту на Гомельшчыне склаў 108,2% пры прагназе 109%. Думаю, па выніках сакавіка на зададзены ўзровень выйдзем. Але трывожыць іншае. Аб'ём вытворчасці перавышае ВРП, а значыць, не ўся прадукцыя рэалізуецца. Па-ранейшаму са стратамі ў вобласці працуюць каля 160 прадпрыемстваў розных формы ўласнасці. Сярод праблем я б выдзеліў і недахоп кваліфікаваных кіраўнікоў. У крэсле дырэктара сёння павінен быць энергічны чалавек, які разбіраецца ў спецыфіцы рынку і ўяўляе перспектыву развіцця грамадства. Я да кадраў заўсёды асабліва ставіўся і стаўлюся. Мой прынцып: дрэнных людзей і спецыялістаў не бывае. Калі з імі працаваць, усё атрымліваецца. Самае галоўнае — аб'яднаць тыя кадры, што ёсць, накіраваць іх на выкананне намечанага: каб мы разам змаглі палепшыць жыццё людзей, якія жывуць на гэтай тэрыторыі. Прымаць нейкія кардынальныя меры па замене кадраў пакуль у мяне настрою няма. Хоць я прыглядаюся.

СТАР. 2

УНП 100782388.

БЕЛРОССТРАХ СТРАХОВАЯ КОМПАНИЯ

Закрытое акционерное общество
«СТРАХОВАЯ КОМПАНИЯ «БЕЛРОССТРАХ»

220030, г. Минск, ул. Ульяновская, 31, факс (017) 210 46 33, тел. 222 48 80

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2010 год

(тыс. руб.)

АКТИВ	СУММА	ПАССИВ	СУММА
1	2	3	4
Основные средства (по остаточной стоимости)	4 789 834,8	Уставный фонд	8 289 283,4
Нематериальные активы (по остаточной стоимости)	895,8	Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	0,0
Доходные вложения в материальные ценности (по остаточной стоимости)	0,0	Резервный фонд	286 662,6
Вложения во внеоборотные активы	10 052,4	Добавочный фонд	1 846 978,6
В том числе: незавершенное строительство	0,0	Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	0,0
Прочие внеоборотные активы	0,0	Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	4 534 040,6
Запасы и затраты	735 379,9	Целевое финансирование	0,0
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	708 975,9	Доходы будущих периодов	831 757,6
расходы будущих периодов	26 404,0	Страховые резервы и фонды – всего	16 398 402,1
прочие запасы и затраты	0,0	В том числе: страховые резервы	15 790 978,8
Доля перестраховщиков в страховых резервах	709 777,8	фонды предупредительных (превентивных) мероприятий, гарантийные и иные фонды, образованные в соответствии с законодательством	607 423,3
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	0,0	Долгосрочные кредиты и займы	0,0
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	1 679 866,7	Прочие долгосрочные обязательства	0,0
Расчеты с учредителями	0,0	Краткосрочные кредиты и займы	
В том числе: по вкладам в уставный фонд	0,0	Кредиторская задолженность – всего	1 513 239,9
Денежные средства	24 596 175,1	Задолженность перед участниками (учредителями)	0,0
Финансовые вложения	1 178 382,3	Резервы предстоящих расходов	0,0
Прочие оборотные активы	0,0	Прочие краткосрочные обязательства	0,0
БАЛАНС	**33 700 364,8**	**БАЛАНС**	**33 700 364,8**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2010 год

(тыс. руб.)

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ		
Страховые взносы (премии) полученные, брутто	010	
Страховые выплаты	020	
Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или –)	030	
Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	040	
Расходы на ведение дела	041	
Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или –)	050	
II. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ		
Страховые взносы (премии) с учетом перестрахования, нетто	064	29 848 049,8
Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (+ или –)	067	52 808,3
Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования	082	21 198 319,7
Изменение резервов убытков (страховых выплат) с учетом перестрахования (+ или –), нетто	092	1 397 436,7
Изменение других технических резервов (+ или –)	100	0,0
Изменение иных страховых резервов (+ или –)	105	0,0
Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды	110	94 189,0
Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательством	115	0,0
Расходы на ведение дела	120	12 863 496,0
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	122	94 260,7
Поступления, связанные с реализацией перешедшего к страховщику права требования страхователя (выгодоприобретателя) к лицу, ответственному за убытки, возмещенные в результате страхования	125	284 337,6
Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или –)	130	-2 479 111,6
III. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Операционные доходы	140	16 667 286,6
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	141	46 317,0
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	150	16 620 969,6
Операционные расходы	160	14 190 786,2
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	170	2 430 183,4
IV. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Внереализационные доходы	180	2 567 020,5
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	181	0,0
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	190	2 567 020,5
Внереализационные расходы	200	1 247 948,6
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	210	1 319 071,9
Прибыль (убыток)	220	1 270 143,7
Налог на прибыль	260	465 982,0
Прочие налоги, сборы из прибыли	270	44 268,2
Прочие расходы и платежи из прибыли	280	0,0
Чистая прибыль (убыток)	300	759 893,5

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
по бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «Страховая Компания «Белросстрах» за период с 1 января по 31 декабря 2010 года

Руководителю ЗАО «СК «Белросстрах» В.А Лаврусенко

Аудируемое лицо:

Наименование: закрытое акционерное общество «Страховая Компания «Белросстрах»;

Место нахождения: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ульяновская, дом 31, литер Е б/к;

Сведения о государственной регистрации: № 100782388 от 17 февраля 2009 года, УНП 100782388.

Аудиторская организация:

Наименование: общество с дополнительной ответственностью «ПРОМАУДИТ»;

Место нахождения: 220090, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кольцова, д. 39, корп. 1, комн. 1;

Сведения о государственной регистрации: № 100073476 от 31 октября 2000 года, УНП 100073476.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности закрытого акционерного общества «Страховая Компания «Белросстрах», состоящей из:

- бухгалтерского баланса на 1 января 2011 года;
- отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении капитала, отчета об основных показателях финансово-хозяйственной деятельности, отчета о движении денежных средств за период с 1 января по 31 декабря 2010 года;
- отчета о платежеспособности на 1 января 2011 года;
- отчета о размещении страховых резервов, минимального размера уставного фонда на 1 января 2011 года;
- пояснительной записки.

Руководство ЗАО «СК «Белросстрах» несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на:

- разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий;
- выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной бухгалтерской (финансовой) отчетности и соответствии совершенных ЗАО «СК «Белросстрах» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ЗАО «СК «Белросстрах» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАО «СК «Белросстрах», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗАО «СК «Белросстрах» на 1 января 2011 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2010 год, при этом совершенные ЗАО «СК «Белросстрах» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

Руководитель аудиторской организации:
Директор ОДО «ПРОМАУДИТ»
А.В. Анисович **24 февраля 2011 года**

Аудитор, возглавлявший аудит:
Директор ОДО «ПРОМАУДИТ»
А.В. Анисович **24 февраля 2011 года**

Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом:
Руководитель аудиторской организации:
Директор ОДО «ПРОМАУДИТ»
А.В. Анисович 24 февраля 2011 года

Представитель аудируемого лица:
Главный бухгалтер ЗАО «СК «Белросстрах»
В.Н. Акулович 24 февраля 2011 года

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВАТЫКАН ЗАЯВІЎ ПРА ДЗЯСЯТКІ МІРНЫХ ЛІВІЙЦАЎ, ЗАГІНУЛЫХ ПАД БАМБЁЖКАМІ

Упершыню з пачатку ваеннай аперацыі Захаду ў Лівіі з незалежнай крыніцы паступіла вестка пра ахвяр сярод мірнага насельніцтва. Прадстаўнік Ватыкана ў Трыпалі паведаміў пра забойства 40 чалавек у выніку бамбардзіроўкі кааліцыяй у лівійскай сталіцы. НАТА, да якой ад ЗША перайшло камандаванне місіяй у Лівіі, абяцае пачаць расследаванне.

Паводле слоў вікарыя Джавані Марцінэлі, адзін з удараў разбурыў жылы будынак, у якім і знаходзілася людзі. Ён удакладніў, што атрымаў гэтыя звесткі адразу з некалькіх «паважаных крыніц», перадае афіцыйнае інфармагенцтва Ватыкана Fides.

«Так званыя гуманітарныя рэйды прыводзяць да ахвяр сярод грамадзянскага насельніцтва, — піша святар. — Нават калі бамбаванні накіраваны на ваенныя аб'екты, закранутым аказваецца і мірнае насельніцтва, на абарону якога нібы разлічана міжнародная аперацыя».

Нагадаем, дагэтуль лівійскія ўлады адчайна спрабавалі пераканаць свет у тым, што ўдары кааліцыі прыводзяць да шматлікіх мірных ахвяр. Самі ўдзельнікі кааліцыі сцвярджаюць, што ў іх няма ніводнага сведчання пра ахвяр сярод мірных жыхароў.

МЗС ДАЗВАЛЯЕ АДПАЧЫНАК У ЕГІПЦЕ

Міністэрства замежных спраў Расіі абвясціла пра нармалізацыю становішча на найбольш папулярных сярод расіян егіпецкіх курортах Хургада і Шарм-эль-Шэйх.

МЗС рэкамендуе расіянам наведваць толькі гэтыя курорты, пазбягаючы іншых раёнаў краіны. Таксама міністэрства раіць турыстам карыстацца паслугамі праверaных турaператараў і падарожнічаць вялікімі групамі. Першыя рэйсы на егіпецкія курорты будуць адпраўлены 2-3 красавіка, паведамляе Асацыяцыя турaператараў Расіі.

Раней МЗС РФ неаднаразова заклікала грамадзян Расіі ўстрымацца ад паездак на любыя курорты Егіпта ў сувязі з нестабільным палітычным становішчам у краіне.

ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ ВАЙНУ ВЯРНУЛІ Ў ПАДРУЧНІК ГІСТОРЫІ УКРАІНЫ

У новым падручніку гісторыі Украіны для 11-х класаў зноў уводзіцца паняцце Вялікай Айчыннай вайны. Раздзел падручніка пра вайну 1939—1945 гадоў будзе звацца «Украіна падчас Другой сусветнай вайны. Вялікая Айчынная вайна», хоць у папярэдняй рэдакцыі кнігі ад 2005 года адпаведная частка насіла назву «Украіна ў гады Другой сусветнай вайны». З тэкстам новага падручніка азнаёмілася газета «Сёння».



У папярэдняй рэдакцыі падручніка «Вялікая Айчынная вайна» таксама сустракалася, аднак падкрэслівалася, што гэты тэрмін быў уведзены савецкімі ідэолагамі. Іншыя змены датычацца ролі і значэння Украінскага паўстанцкага войска (УПВ). Станоўчых ацэнак яе ролі не было і ў рэдакцыі 2005 года, аднак у новым падручніку дзеянні УПВ падчас вайны займаюць прыблізна той жа аб'ём, што і аповед пра савецкіх партызанаў, паведамляе «Сёння». У старым падручніку інфармацыі пра дзеянні УПВ было прыкладна столькі ж, колькі пра бітвы Чырвонай арміі. Акрамя таго, у тэксце знікла згадванне пра 47 баёў УПВ з немцамі і 54 баі з савецкімі партызанамі.

УВАГА: ПРАВЯРАЕМ СЯБЕ НА КЕМЛІВАСЦЬ І ПАЧУЦЦЁ ГУМАРУ!

Конкурс

Вітаем вас, шаноўныя чытачы! Сёння ў нас што? Правільна, 1 красавіка — Дзень смеху. А гэта азначае, што па традыцыі «Звязда» праводзіць конкурс.

Умовы, як заўсёды, простыя: у сённяшнім нумары газеты змешчаныя адзін або некалькі матэрыялаў (трэба ж вас крыху заблытаць, праўда?), якія насамрэч не адпавядаюць рэчаіснасці. Іншымі словамі, яны жартоўныя, цалкам выдуманыя. Іх трэба знайсці. А потым патэлефанаваць па нумары 287 18 36 у рэдакцыю (з 15 да 17 гадзін) і назваць гэты матэрыял (або матэрыялы). Падказак пры адказе не чакайце, не марудзьце, добра падумайце, каб быць гатовымі адразу дакладна назваць сваю версію.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Усе, хто зможа звязацца з рэдакцыяй у азначаны перыяд (ні да, ні пасля адказы не прымаюцца), і правільна назваць (пералічыць) жартоўныя першакрасавіцкія матэрыял або матэрыялы, якія змешчаны ў гэтым нумары «Звязды», атрымаюць ад рэдакцыі аднолькавыя падарункі. Кожнаму даецца толькі адна спроба, таму будзьце ўважлівыя. Вынікі конкурсу будуць падведзены ў бліжэйшы ж дні. Засяродваем вашу ўвагу: за правільны адказ будзе прымацца толькі той, у якім будуць пералічаныя ўсе жартоўныя матэрыялы, змешчаныя ў нумары.

Расчетный центр Национального банка Республики Беларусь

предлагает к реализации бывшие в употреблении магнитные картриджи **IBM 3480** и **IBM 3490** объемом 0,8 — 1,2 Gb (без гарантии) в количестве **5000 шт.**

Контактные телефоны:
(8 017) 259 14 15,
(8 029) 690 32 19.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.04.2011 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	3 045,00	1 чэшская крона	175,99
▲ 1 еўра	4 318,42	1 польскі злоты	1 076,16
1 латвійскі лат	6 090,61	▼ 1 расійскі рубель	106,78
1 літоўскі літ	1 251,18	1 украінская грыўня	381,94

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	28,5162
10 UAH	35,7682
10000 BYR	93,6185
EUR	40,3875

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь павіншаваў калектыў Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта з 45-годдзем з дня заснавання ВНУ

«Ваша ВНУ прайшла шлях ад інжынерна-будаўнічага інстытута да шматпрофільнага ўніверсітэта, стаўшы буйным цэнтрам вышэйшай тэхнічнай адукацыі і даследнай думкі. За ўсю гісторыю ў ёй падрыхтавана каля 30 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія плённа працуюць як на Брэстчыне, так і за яе межамі», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што вынікі даследаванняў універсітэцкіх вучоных у галіне будаўніцтва, архітэктуры, машынабудавання, экалогіі, электронікі і эканомікі атрымалі міжнароднае прызнанне і шырока выкарыстоўваюцца ў народнай гаспадарцы.

Прэзідэнт пажадаў усім студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам ВНУ поспехаў, здароўя, шчасця і дабрабыту.

Аляксандр Лукашэнка: мы ведалі і любілі Людмілу Гурчанку як адну з самых яркіх зорак нашага часу

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі са смерцю народнай артысткі СССР Людмілы Гурчанкі выказаў глыбокія спачуванні родным і блізкім артысткі.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, Людміла Гурчанка назаўсёды ўвайшла ў гісторыю як сапраўды легендарная фігура савецкага і расійскага кінематографа, актрыса вялікага і шматграннага таленту, які яна шчодра дарыла мільёнам прыхільнікаў.

«Мы ведалі і любілі Людмілу Гурчанку як адну з самых яркіх зорак нашага часу, кожны прыезд якой на беларускую зямлю ператвараўся ў сапраўднае творчае свята. Яе цудоўныя фільмы, песні і кнігі назаўсёды застануцца з намі, аб'ядноўваючы краіны і народы», — гаворыцца ў спачуванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БЕЛАРУСЬ У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС ПРАДАСТАВІЦЬ РАСІІ НЕАБХОДНУЮ ІНФАРМАЦЫЮ ДЛЯ АТРЫМАННЯ КРЭДЫТАЎ

Беларусь у бліжэйшы час прадаставіць Расіі неабходную інфармацыю аб грашова-крэдытнай, бюджэтна-падатковай палітыцы для атрымання расійскіх крэдытаў. Аб гэтым заявіў учора намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей Румас, адказваючы на пытанні ў ходзе прамой лініі ў газеце «Рэспубліка», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Сяргей Румас нагадаў, што Беларусь падала дзве заяўкі на атрыманне міждзяржкрэдыту ад Расіі ў памеры $1 млрд і крэдыту ад Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС у суме $2 млрд. «Разгляд заявак ідзе паралельна. Мы падрыхтавалі ўсю неабходную для расійскага боку інфармацыю. У бліжэйшы час яна будзе прадастаўлена», — сказаў Сяргей Румас.

Ён паведаміў, што пасля гэтага з расійскім бокам будуць весціся перагаворы, наколькі гэта інфармацыя іх задавольвае.

Што датычыцца тых мер, якія будуць закладзены ў пісьме расійскаму боку, Сяргей Румас адзначыў, што Беларусь прадугледжвае там меры па ўзмацненні грашова-крэдытнай, бюджэтна-падатковай палітыкі, па структурных рэформах, а таксама зніжэнне аб'ёмаў фінансавання дзяржпраграм у 2011 годзе. «Гэтыя меры накіраваны на стрымліванне ўнутранага сукупнага попыту. Жыць трэба па сродках», — дадаў Сяргей Румас. Намеснік прэм'ер-міністра лічыць, што калі гэтыя меры не будуць прыняты, то сітуацыя ў эканоміцы Беларусі можа пайсці ў негатыўным напрамку.

Беларусь скарачае расходы бюджэту і плануе зменшыць узровень дэфіцыту бюджэту да 1,5 працэнта да ВУП.

«І ў перагаворах з Расійскай Федэрацыяй, і ў цэлым для стабілізацыі сітуацыі мы разглядаем меры па ўзмацненні бюджэтна-падатковай палітыкі, у тым ліку і тое, якія непершачарговыя расходы бюджэту можна скараціць», — сказаў Сяргей Румас.

Паводле яго слоў, хутчэй за ўсё, будзе вынесена абмежаванне ў інвестыцыйнай праграме, якая фінансуецца за кошт бюджэту, а таксама па шэрагу будоўляў, якія ўрад лічыць непершачарговымі на цяперашнім этапе. Яны ў 2011 годзе пачынацца не будуць.

«Усяго ж агульнае скарачэнне расходаў бюджэту павінна нам дапамагчы ўвайсці ў дэфіцыт, які абмяжоўваецца 1,5 працэнта ВУП», — адзначыў Сяргей Румас.

Законам аб бюджэце на 2011 год запланаваны дэфіцыт бюджэту ў памеры Br6 трлн, або 3 працэнты ВУП. Такім чынам, скарачэнне расходаў у гэтым годзе можа скласці Br3 трлн.

Падстаў для перагляду прагнознага ўзроўню інфляцыі ў 2011 годзе няма.

«Мы лічым, што сёння падстаў для перагляду прагнозу па гадавой інфляцыі няма, і ўрад будзе рабіць усё магчымае, каб упісацца ў зацверджаныя параметры», — сказаў Сяргей Румас.

«Так, у лютым інфляцыя ў Беларусі была вышэйшая за сярэднегадавую. У многім гэта звязана з ростам тарыфаў на паслугі ЖКХ. Па сакавіку сітуацыя лепшая, але ўсё роўна чакаецца, што інфляцыя будзе вышэйшая за сярэднегадавы ўзровень, які мы планавалі», — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

Сяргей Румас адзначыў, што ў цяперашніх умовах прадказаць гадавую інфляцыю даволі складана, таму што ўсё будзе залежаць ад валютных абмежаванняў на рынку, «бо сёння ніхто з экспертаў не можа сказаць, як гэта адаб'ецца на рэальным сектары эканомікі». Паводле слоў Сяргея Румаса, многія вытворцы закладваюць відавочна завышаны курс беларускага рубля ў цану тавару. «Таму, напэўна, ураду давядзецца прымаць нейкія дадатковыя меры для стрымлівання інфляцыі», — адзначыў намеснік прэм'ер-міністра.

Інфляцыя ў Беларусі ў студзені-лютым склала 4,2 працэнта. У 2011 годзе інфляцыя прагназуецца на ўзроўні 7,5-8,5 працэнта. Гэта прадугледжана Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2011 год.

АДНОСНА БЕЛАРУСІ ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЦА РЫТОРЫКА ЧАСОЎ ХАЛОДНАЙ ВАЙНЫ І ЖАЛЕЗНАЙ ЗАСЛОНЫ

Такая думка змешчана ў звароце кіраўнікоў і актывістаў непалітычных грамадскіх арганізацый беларускай дыяспары суседніх з Беларуссю краін да кіраўнікоў дзяржаў Еўрапейскага саюза, членаў Савета Еўропы, дэпутатаў Еўрапарламента, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

«У Еўрапейскім саюзе, ЗША і іншых краінах разгорнута кампанія націску на нашу этнічную Радзіму ў сувязі з падзеямі 19 снежня 2010 года. У сусветных СМІ прадаўжаецца абмеркаванне пытанняў аб увядзенні жорсткіх эканамічных санкцый супраць Беларусі, пры гэтым у заявах асобных высокапастаўленых асоб Еўрасаюза, які славіцца прыхільнасцю да ліберальных каштоўнасцяў і ідэй талерантнасці, выкарыстоўваецца рыторыка часоў халоднай вайны і жалезнай заслоны», — адзначаюць прадстаўнікі беларускай дыяспары за мяжой.

У звароце адзначаецца, што гістарычны вопыт, напрацаваны еўрапейскай цывілізацыяй за апошнія дзве тысячы гадоў, сведчыць аб бесперспектыўнасці выкарыстання сілы ў міжнароднай палітыцы, навязвання народам незалежных дзяржаў чужой волі. Пераход з мовы дыпламатыі, добрасуседства да дыктату і дыскрымінацыі ніколі не даваў і не дасць канструктыўных вынікаў. Спробы знешняга націску і насілля традыцыйна выклікаюць у беларусаў пачуццё ўнутранага супраціўлення і пратэсту. На працягу свайго гісторыі беларусы даказалі, што могуць супраціўляцца націску. Прыкладам таго з'яўляецца сапраўды ўсенародная супраціўленне беларусаў нацысцкай акупацыі ў гады Другой сусветнай вайны, якое дало магчымасць ганарыцца сваім імем і стала асновай самасвядомасці беларускага народа. «Заслугі беларускага народа ў процістаянні самаму страшнаму ў чалавечай гісторыі злу былі прызнаны міжнародай супольнасцю, далі магчымасць нашай Радзіме, якая ўваходзіла тады ў склад Савецкага Саюза, у 1945 годзе стаць краінай — заснавальніцай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый», — сказана ў звароце.

«Беларусы — працаўнікі празмернага прымянення сілы, дзе б гэта ні адбывалася: у Маскве або ў Парыжы, у Лос-Анджэлесе або ў Берліне, у Мінску або краінах Балтыі», — падкрэсліваюць прадстаўнікі беларускай дыяспары за мяжой. На кожную пратэстную акцыю, як правіла, ёсць два процілеглыя погляды. Рэакцыя на гэтыя падзеі еўрапейскай палітычнай супольнасці паставіла ў беларускім грамадстве пад сумненне вынікі трохгадовай сумеснай работы Беларусі і ЕС. «У Беларусі замацавалася думка, што Еўропе верыць нельга. Ці патрэбна гэта Беларусі і Еўрапейскаму саюзу? Cui prodest? (Каму гэта выгадна?)», — гаворыцца ў звароце. «Паверце, беларусы не сталі б трываць над сабой ні дыктатара, ні іншых прыгнятальнікаў — не пакарыліся беларусы ні татарам, ні шведам, ні крыжаносцам, ні польскім нацыяналістам, ні нямецка-фашысцкім захопнікам, не трывалі б дыктату і ў наш час», — адзначылі беларусы, якія пражываюць далёка ад Радзімы.

Са шкадаваннем трэба канстатаваць: сёння ў Беларусі няма палітычнай апазіцыі, якая вядзе канстытуцыйным шляхам барацьбу за ўладу і выбаршчыкаў. Групы і часовыя аб'яднанні, якія пастаянна сварацца, хутчэй падобны да падпольных арганізацый з незразумелымі для беларусаў мэтамі і каштоўнасцямі. «Таму нас насцярожвае тая паспешлівасць, з якой структуры Еўрасаюза прымаюць рашэнні аб падтрымцы і фінансаванні гэтых структур. Фактычнае выштурхоўванне Беларусі з агульнаеўрапейскіх працэсаў нічога добрага ні Еўропе, ні Беларусі не прынясе», — упэўнены прадстаўнікі грамадскіх арганізацый беларускай дыяспары. «Мы заклікаем усіх, хто хоча дабра беларусам, хто сапраўды лічыць Рэспубліку Беларусь неад'емнай часткай Еўропы, пачуць наш голас і вярнуцца да канструктыўнага дыялогу з нашай Радзімай. Толькі ў сумеснай рабоце, у доказных спрэчках, у павазе думкі бакоў і ўзаемнай адкрытасці мы прыйдзем да сапраўднага разумення адзін аднаго», — перакананы прадстаўнікі беларускай дыяспары.

Подпісы пад зваротам паставілі беларусы Латвіі, Літвы, Эстоніі, Расіі, Украіны, Малдовы і іншыя.

ПРАВЕРКІ НЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДЗЕЛЯ ПРАВЕРАК

Учора адбылося сумеснае пасяджэнне калегій Генеральнай пракуратуры і Камітэта дзяржаўнага кантролю. Абмяркоўваліся меры па павышэнні эфектыўнасці работы кантралюючых (наглядных) органаў у краіне.

З уступленнем у сілу Указа Прэзідэнта №510 «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» кантралюючыя органы менш сталі адцягваць службовых асоб ад іх непасрэднай працы. У прыватнасці, колькасць праверак фінансава-гаспадарчай дзейнасці скарацілася больш чым у 2 разы. Сумесныя праверкі складаюць трэцюю частку ад агульнай колькасці праведзеных. Значна скарацілася «праверачная нагрузка» на буйныя прадпрыемствы.

Але, нягледзячы на тое, што агульная колькасць праверак істотна зменшылася, колькасць наглядных праверак па краіне яшчэ застаецца дастаткова высокай. Так, усяго ў 2010 годзе праведзена 230 тысяч праверак. Удзельная вага наглядных праверак — больш за 70 адсоткаў. А што датычыцца пазапланавых праверак, то гэты паказчык ужо павысіўся да 80 адсоткаў. Паводле слоў старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандра ЯКАБСОНА, фактычна гэта асноўная «праверачная нагрузка» на суб'екты гаспадарання. У прыватнасці, застаецца высокай колькасць праверак, праведзеных органамі Міністэрства энергетыкі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства аховы здароўя. Праверкі названых органаў склалі больш як 50 адсоткаў ад агульнай колькасці праверак.

Ёсць і шмат іншых істотных недахопаў і парушэнняў як у ажыццяўленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці, так і ў прафілактычнай рабоце. Сярод іх — правядзенне праверак органамі і службовымі асобамі, якія не маюць ні паўнамоцтваў, ні падстаў для іх правядзення. Правяраліся суб'екты гаспадарання, з моманту стварэння якіх прайшло менш як 2 гады, што катэгарычна забаронена Указам. Не выконваліся патрабаванні заканадаўства пры афармленні матэрыялаў праверак. Акрамя таго, як адзначыў Аляксандр Якабсон, зафіксаваныя шматлікія факты, калі запланаваную праверку просяць выключыць з плана, бо высвятляецца, напрыклад, што ў гэтага суб'екта гаспадарання на паднаглядной тэрыторыі, акрамя юрыдычнага адраса, нічога няма. Так, усяго з каардынацыйных планаў у 2010 годзе ў рэспубліцы падчас іх выканання выключана 6,5 тысячы праверак. Гэта сведчыць, паводле слоў старшыні КДК, аб фармальным падыходзе пры планаванні гэтых праверак.

— Праверак яшчэ дастаткова шмат, а што мы маем у выніку? — разважае Аляксандр Якабсон. — У 2010 годзе ўзраслі паказчыкі аварыйнасці і траўматызму з цяжкім і смяротным зыходам. Гэта сведчыць аб тым, што толькі праверкамі і пакараннямі па факце праблему не вырашыш. Нельга падмяняць праверкамі штодзённую работу па прафілактыцы бяспекі вытворчасці, жыцця і здароўя людзей. У краіне зарэгістравана крыху менш як 400 тысяч юрыдычных асоб і прадпрымальнікаў. Усіх праверыць немагчыма, ды і не трэба гэтага. Галоўная задача наглядных органаў — папярэдзіць узнікненне небяспечных сітуацый на прадпрыемстве, папярэдзіць магчымую пагрозу жыццю і здароўю людзей. Калі пажар ці выбух ужо адбыўся, то штрафаваць ужо позна...

— У дзейнасці кантралюючых органаў пакуль пераважае, на жаль, накіраванасць на выяўленне парушэнняў, а не на іх папярэджанне, — адзначыў **Генеральны пракурор Беларусі Рыгор ВАСІЛЕВІЧ**. — Трэба мяняць формы работы: кантрольная і наглядная дзейнасць павінна насіць пераважна папераджальны характар.

Генеральны пракурор лічыць, што праверка не павінна праводзіцца дзеля праверкі і што праверак павінна быць роўна столькі, колькі патрэбна: ні на адну больш, ні на адну менш. Кожная праверка пры гэтым павінна быць нечым абумоўлена і павінна праводзіцца тады, калі дакладна вядома, што там ёсць поле для дзеяння, а не дзеля галачкі, як гэта часта бывае. На гэта накіраваныя і Указ № 510, і Дырэктыва № 4.

А для гэтага трэба, дадаў Аляксандр Якабсон, займацца аналітычнай работай і сістэматычна праводзіць вучобу, у тым ліку і наглядных органаў. Старшыня КДК лічыць, што наглядныя органы павінны прытрымлівацца наступнага падыходу: калі парушэнне не носіць сістэмны характар, то трэба абмяжоўвацца мінімальнымі санкцыямі. Прыцягнуць да адказнасці — гэта не самамэта. Важна, каб суб'екты гаспадарання працавалі і прыносілі карысць дзяржаве.

Для таго, каб павысіць эфектыўнасць дзяржаўнага кантролю і нагляду, на сумеснай калегіі двух ведамстваў было прапанавана ўнесці некаторыя змены і дапаўненні ва Указ №510. У прыватнасці, прапанаваць Савету Міністраў заканадаўча вызначыць мэты і задачы дзяржаўнага энергетычнага нагляду, статус гэтых наглядных органаў і паўнамоцтвы службовых асоб, якія ажыццяўляюць нагляд. Унесці змены і дапаўненні ў частцы прававога рэгулявання іншых, акрамя праверкі, метадаў ажыццяўлення нагляду. У прыватнасці, прадугледзець магчымасць доступу службовых асоб упаўнаважаных органаў на тэрыторыю прадпрыемстваў. У мэтах рэалізацыі права прызначаць пазапланавыя праверкі для ажыццяўлення дзяржаўнага нагляду за эксплуатацыяй патэнцыйна небяспечных аб'ектаў выпрацаваць адзіныя крытэрыі аднясення аб'ектаў нагляду да катэгорыі патэнцыйна небяспечных. Акрамя таго, КДК сумесна з Генеральнай пракуратурай прапануюць павысіць адміністрацыйную адказнасць за парушэнне ўстаноўленага парадку прызначэння праверак, а таксама прадаставіць КДК і Камітэтам дзяржаўнага кантролю абласцей права выключаць з каардынацыйных планаў кантрольнай (наглядной) дзейнасці праверкі, якія ўключаны ў планы беспадстаўна.

Надзея ДРЫЛА.

Мікалай СНАПКОЎ:

«Эканамічная сітуацыя характарызуецца стабільным ростам»

Пра гэта журналістам на брыфінгу заявіў міністр эканомікі Мікалай СНАПКОЎ:

— Эканамічная сітуацыя зараз характарызуецца, на погляд Міністэрства эканомікі, стабільным ростам, мы чакаем 8,1% прыросту ВУП па выніках квартала. Пры гэтым рост аб'ёму прамысловай вытворчасці будзе па прагнознай ацэнцы ў межах 11,5%. Радуюць праведзеныя даследаванні наконт наяўнасці кантрактаў у прадпрыемстваў-вытворцаў прамысловай прадукцыі: яны ў параўнанні з 2008 годам дасягнулі найбольшай велічыні і складаюць 3,3 месяца наяўнасці кантрактаў для забеспячэння вытворчасці, — адзначыў Мікалай Генадзьевіч.

Таксама ён паведаміў, што прадукцыйнасць працы ацэньваецца на ўзроўні 7,2%, і Міністэрства эканомікі разглядае яго як асноўны паказчык, бо на 2011 год і на пяцігодку ўрад нацэліў усіх перш за ўсё на выкананне якасных паказчыкаў:

— 7,2% прыросту па кварталe Міністэрства эканомікі задавольваць не можа. І гэты паказчык, і роля міністэрстваў і ведамстваў у ім павінны быць больш глыбока прааналізаваны. І, я мяркую, што па выніках квартала Мінэканомікі на Саўміне пра гэта даложыць.

Што тычыцца працэнтных ставак па крэдытах, якія, па словах міністра эканомікі, з'яўляюцца адным з асноўных індыкатараў макраэканамічнага развіцця, то яны павысіліся і зараз складаюць 18-19% для юрыдычных асоб і 16-20% пры спажывецкім крэдытаванні. Мікалай Снапкоў адзначыў, што з улікам сітуацыі на сусветных рынках пытанні павелічэння працэнтных ставак разглядаюцца і ва ўсіх краінах-суседзях, у тым ліку і еўразоне.

— Індэкс спажывецкіх цэн за студзень-люты склаў 4,2%, станоўчым фактарам з'яўляецца тое, што за тры тыдні сакавіка павышэнне інфляцыі знізілася і па нашых разліках складае 1,3-1,4%. Гэта сведчыць пра тое, што ажыятажны і, як мы лічым, спекулятыўны попыт у пачатку года на некаторыя харчовыя тавары спаў. Індэкс цэн вытворцаў прамысловай прадукцыі за студзень-люты склаў 105,6%. Як бачыце, ён апярэджае індэкс спажывецкіх тавараў — гэта, на наш погляд, негатыўны фактар, па кварталe мы мяркуем працягванне тэндэнцыі, бо на сыравінных рынках па-ранейшаму назіраецца рост цэн, што, безумоўна, уплывае на нашых вытворцаў, — сказаў Мікалай Снапкоў.

Калі гаварыць пра сальда знешняга гандлю, то яно за 2 месяцы 2011 года склалася адмоўнае — у памеры 1 млрд 967 млн долараў:

— Мы бачым наступныя аспекты, якія паўплывалі на адмоўнае сальда, — гэта рост сыравінных тавараў, перш за ўсё нафты. А нафтапрадукты, як адзін са складнікаў нашага экспарту, вядуць сябе наступным чынам: павышэнне кошту кошыка нафтапрадуктаў, якія пастаўляюцца на экспарт, звычайна не паспявае за павышэннем нафты. І гэта адбываецца з разрывам 2-3 тыдні мінімум. А значыць, для пакрыцця тых выдаткаў, якія ажыццявілі нашыя перапрацоўчыя заводы па набыцці нафты, неабходна больш часу. Такім чынам адбываецца ў кароткачасовай перспектыве вымыванне валютных сродкаў. Таксама дастаткова важкі ўнёсак у мінусавае сальда зрабіў імпарт лёгкавікоў фізічнымі асобамі.

Мікалай Снапкоў лічыць таксама, што грошы ў насельніцтва ёсць, але яны не на банкаўскіх рахунках:

— Захоўваецца пазітыўны рост спажывецкага попыту на рынку: мы ацэньваем яго па кварталe недзе ў памеры 124% — пры тым, што рэальныя даходы насельніцтва выраслі толькі на 18%. Гэта пацвярджае тое, што накапленняў у насельніцтва дастаткова, і нас, як Міністэрства эканомікі, бянтэжыць, што гэтыя сродкі на руках, а не ў банкаўскай сістэме. Мы лічым, што праца з насельніцтвам — перш за ўсё ў нацыянальнай валюце — павінна весціся больш агрэсіўна, на аснове, безумоўна, забеспячэння станоўчых працэнтных ставак з пункту гледжання атрымання даходнасці ў адносінах да інфляцыі.

Пры гэтым міністр эканомікі на пытанне журналістаў наконт магчымай дэвальвацыі адказаў так:

— Вы мяркуеце, што карэктна задаваць гэтае пытанне міністру эканомікі? Я ў прэамбуле сказаў пра тое, што як эканоміка, так і фінансы маюць на ўвазе спакой і цішыню.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЗААХВОЧВАЛЬНЫ ГРАНТ — НА ПЯЛЮШКІ ХВОРЫМ ДЗЕЦЯМ

Грамадская арганізацыя «Белая Русь» Кастрычніцкага раёна горада Магілёва перадала на дабрачынныя мэты грант у 50 базавых велічынь.

Гэтыя грошы грамадскія актывісты «Белай Русі» атрымалі за другое месца ў аглядзе-конкурсе Магілёўскай вобласці і цяпер выкарысталі на карысць дзіцячага інфекцыйнага аддзялення Магілёўскай бальніцы № 1. Што за іх набыць — вырашылі разам з персаналам аддзялення: сродкаў хапіла на закуп больш за 400 баваўняных пялюшак. Загадчык аддзялення Мікалай Буракоўскі лічыць гэта вельмі разумным набыццём.

Ілона ІВАНОВА.

2 красавіка — Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі

ШЛЯХАМ НОВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

У Саюзнай дзяржаве сёння ствараюцца праграмы, разлічаныя на аддаленую будучыню. Размова ідзе аб перадавых накірунках навукі і тэхналогій. Плануецца зацвердзіць і спецыяльную прэмію ў галіне навукі і тэхнікі — накшталт той, што ўжо існуе ў галіне літаратуры і мастацтва. Працягваецца арганізацыйная работа па стварэнні Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі і Расіі — накшталт Саюза пісьменнікаў.

Паводле слоў **намесніка Дзяржаўнага сакратара — члена Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Ганны ДЗЕЙКІ**, калі спачатку саюзныя праграмы падтрымлівалі асобныя прадпрыемствы, навуковыя калектывы, аднаўленне пэўных значных тавараў, то сёння стаўка робіцца на праграмы не для бліжэйшай перспектывы — такія, як «Суперкамп'ютар», «Оптыка», «Белрастрансген», «Космас» і інш. У гэтым годзе будуць працаваць звыш 40 сумесных праграм, якія прадугледжваюць фундаментальныя доследы, прыкладныя распрацоўкі, развіццё прамысловасці, транспарту, сувязі, інфарматыкі і сацыяльнай сферы.

4 красавіка ў Мінску і Маскве пройдуць урачыстыя сходы з удзелам палітычных і дзяржаўных дзеячаў, прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, грамадскіх нацыянальна-культурных аб'яднанняў. У сувязі з сёлетнім святкаваннем 50-годдзя палёту Юрыя Гагарына ў космас, удзелам Саюзнай дзяржавы ў рэалізацыі касмічных праграм, гэта падзея будзе адной з цэнтральных у святочных канцэртах. На ўрачыстасці запрошаны расійскія і беларускія касманаўты. Плануецца прыгадаць і 25-годдзе чарнобыльскай трагедыі, наступствы якой краіны пераадольваюць у межах саюзных праграм па гэтай тэматыцы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПЕРАБОЯЎ З АЙЧЫННЫМІ БУДМАТЭРЫЯЛАМІ НЕ ІСНУЕ

Апошнім часам пачалі з'яўляцца чуткі наконт таго, што ў будаўнічых арганізацыях узнікаюць праблемы з будматэрыяламі, якія выкліканы неадназначнай сітуацыяй вакол валюты.

Як паведаміла рэдакцыі намеснік начальніка аддзела прамысловасці будаўнічых матэрыялаў Мінбудархітэктуры Галіна Лапука, ніякіх праблем з пастаўкамі айчынных будаўнічых матэрыялаў на будпляцоўкі не існуе. Наадварот, пасля зімы ў вытворцаў будматэрыялаў ёсць вялікія запасы цэменту, газасілікатных блокаў і цэглы. Праўда, часам узнікаюць пытанні са шчэбнем, аднак гэта адбываецца ў сувязі з недапрацоўкай транспартнікаў, лічыць спецыяліст. Ніякіх сігналаў аб перабоях з будматэрыяламі з боку будтрэстаў у міністэрства не паступала, удакладніла Галіна Лапука.

Сяргей КУРКАЧ.

МЗС БЕЛАРУСІ НЕ ВЫКЛЮЧАЕ ЎВЯДЗЕННЯ КРАІНАМІ МЫТНАГА САЮЗА Ў ПЕРСПЕКТЫВЕ АДЗІНАЙ ВІЗЫ

МЗС Беларусі не выключае, што ў перспектыве краіны Мытнага саюза могуць увесці адзіную візу, аналагічную шэнгенскай. Аб гэтым заявіў учора, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Андрэй Савіных.

У той жа час прэс-сакратар падкрэсліў, што пытанне аб уніфікацыі пашпартна-візавага рэжыму краін Мытнага саюза знаходзіцца толькі на пачатковай стадыі разгляду. Ён лічыць, што гэта можа закрануць такія пытанні, як рэжым знаходжання замежных грамадзян на тэрыторыі трох краін, выкарыстанне працоўнай сілы іншаземцаў на тэрыторыі Мытнага саюза, уніфікацыя правіл і ўмоў выдачы віз, а таксама ўніфікацыя візавых рэжымаў з трэцімі краінамі.

Закрыццё офіса АБСЕ ў Мінску не азначае зніжэння ўзроўню ўзаемадзеяння з гэтай арганізацыяй, наадварот, Беларусь разлічвае на далейшую інтэнсіфікацыю супрацоўніцтва. Беларусь плануе развіваць супрацоўніцтва з АБСЕ па ўсіх напрамках праграмных дзейнняў, і беларускі бок аб гэтым неаднаразова заяўляў. Паводле слоў прэс-сакратара МЗС, яскравае сведчанне таго — прысутнасць наглядальнікаў АБСЕ на судовых пасяджэннях. «Закрыццё офіса АБСЕ ні ў якай меры не можа азначаць зніжэння ўзроўню ўзаемадзеяння з гэтай арганізацыяй. Наадварот, мы разлічваем на далейшую інтэнсіфікацыю нашага супрацоўніцтва», — сказаў Андрэй Савіных.

Афіцыйная дэлегацыя Беларусі прыме ўдзел у першай сесіі Асамблеі Міжнароднага агенцтва па аднаўляльнай энергіі (IRENA), якая адбудзецца 4-5 красавіка ў штаб-кватэры агенцтва ў Абу-Дабі (Аб'яднаныя Арабскія Эміраты), паведаміў Андрэй Савіных.

ДЗЯРЖАЎТАІНСПЕКЦЫЯ ЗАКЛІКАЕ МІНЧАН НЕ СТВАРАЦЬ АЖЫЯТАЖ ВАКОЛ АТРЫМАННЯ НОВЫХ ВАДЗІЦЕЛЬСКІХ ПРАВОЎ

Дзяржаўтаінспекцыя заклікае мінчан не ствараць ажыятаж вакол атрымання новых вадзіцельскіх правоў. Як паведаміў карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» інспектар аддзела агітацыі і прапаганды УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Юрый Карніевіч, каб пазбегнуць марнавання часу, выключэнні чэргаў, стварэння штучнага ажыятажу, Дзяржаўтаінспекцыя сталіцы запрашае для абмену вадзіцельскага пасведчання толькі тых гараджан, у каго тэрмін дзеяння вадзіцельскага пасведчання падыходзіць да заканчэння.

— У чарговы раз тлумачым, што ўвайшоўшыя ў дзеянне 29 сакавіка змяненні ў Венскую канвенцыю «Аб дарожным руху» прадугледжваюць пераходны перыяд для абмену вадзіцельскага пасведчання, які па тэрмінах не абмежаваны. Краіны — удзельніцы Канвенцыі, у тым ліку бліжэйшыя суседзі Беларусі: Расія, Украіна, Літва, Латвія, Польшча, — узялі на сябе абавязацельствы прызнаваць раней выдадзеныя нацыянальныя вадзіцельскія пасведчанні на працягу тэрміну іх дзеяння, — адзначыў Ю. Карніевіч.

Ігар ГОЛАД, «Мінск—Навіны».

ЗНЯЦЬ З УЛІКУ Ў ДАІ СТАРЫ АЎТАМАБІЛЬ МОЖНА БУДЗЕ Ў ЖЭС

У красавіку жыллёвыя службы сталіцы сумесна з ДАІ правядуць акцыю, падчас якой уладальнікі змогуць зняць з уліку аўтатранспарт, які не эксплуатуецца, па месцы жыхарства. Як паведаміла намеснік генеральнага дырэктара ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Галіна Гілевіч, для гэтага ў пэўныя дні ў ЖЭС будуць запрашаць супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі. Інфармацыя аб правядзенні акцыі будзе размешчана на дошках аб'яў у пад'ездах і ў дварах, у памяшканнях жыллёвых службаў і разлікова-даведачных цэнтраў. Зараз у сталіцы на дваравых тэрыторыях выяўлены 146 кінутых аўтамабіляў. Іх маркуецца прыняць да канца красавіка.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск—Навіны».

Ну і ну!

У БЕЛАРУСАК — САМЫЯ МАЛЕНЬКІЯ Ў ЕЎРОПЕ ГРУДЗІ

Такія вынікі прадстаўлены ў даследаванні «Сусветная карта памераў грудзей».

Гэткія ж маленькія грудзі (А) як у беларусак, маюць у Еўропе латышкі, а ў свеце — кітаянкі. Такая вось кампенсацыя за нядаўні трыумф беларусаў, якія сталі аднымі з лідараў па памеры чэлесаў у рэгіёне.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК:

«ДРЭННЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ НЕ БЫВАЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У красавіку спаўняецца 25 гадоў з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Якія сродкі плануецца накіраваць на ліквідацыю наступстваў катастрофы ў вобласці?

— Летась завершана рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2006—2010 гады. Пры рэалізацыі новай на перыяд да 2020 года на пацярпелых тэрыторыях трэба завяршыць газіфікацыю, паляпшаць якасць камунальнага і медыцынскага абслугоўвання, забяспечваць ахоўныя меры ў сельскагаспадарчай вытворчасці, закончыць знос непрыдатных для выкарыстання аб'ектаў і гэтак далей. Усяго на фінансаванне мерапрыемстваў Дзяржпрограмы ў вобласці сёлета прадугледжана 632 млрд. рублёў. У праграму ўключаны новы раздзел «Рэалізацыя спецыяльных інавацыйных праектаў», які дазволіць вырашаць пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў. На тэрыторыі найбольш пацярпелых ад катастрофы раёнаў сёлета плануем пачаць рэалізацыю 12 такіх сацпраектаў. Напрыклад, у Брагінскім раёне прадугледжана пашырэнне цэха па перапрацоўцы насення рапсу на базе ААТ «Брагінагрансэрвіс».

— Якія новыя вытворчыя прадпрыемствы плануецца арганізаваць на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў хуткім часе?

— Рэчыцкі метызны завод толькі што ўвёў у эксплуатацыю цэх па гарачым ацынкаванні труб і металаканструкцый. На БМЗ рэалізуецца праект па арганізацыі лістапракатнай вытворчасці. Важны праект рэалізуецца Светлагорскім ЦКК — будаўніцтва завода па вытворчасці беленай сульфатнай цэлюлозы. На Рагачоўскім малочнакансервавым запланавана будаўніцтва цэха па вытворчасці сыроў. На агракамбінаце «Паўднёвы» пачата будаўніцтва камбікормавага завода. У Тураве вядзецца будаўніцтва сучаснага малочнага камбіната. Суб'ектамі прыватнага прадпрымальніцтва, у тым ліку з прыцягненнем замежнага капіталу, плануецца стварэнне вытворчасці па аднаўленні аўтамабільных шын замежным прадпрыемствам «Рылінг Райфен» у Гомельскім раёне. Сумесным прадпрыемствам «Помп-Мікс РБ» пачата рэалізацыя праекта па арганізацыі вытворчасці бетону і жалезабетонных вырабаў. Буйны інвестыцыйны праект рыхтуе да рэалізацыі іранская кампанія «Заморад Кала» па здабычы горнай пароды ў Лельчыцкім раёне. Запланавана вытворчасць сілавых гідрамашын, ацяпляльных радыятараў, а таксама будаўніцтва завода па перапрацоўцы цвёрдых бытавых адходаў і іншыя.

— Наколькі за апошнія паўгода ў вобласці змянілася сітуацыя з якасцю жылля, якое будуецца?

— Прыёмка жылых дамоў у эксплуатацыю з мая мінулага года ў нас вядзецца толькі пры наяўнасці даведак з подпісамі жыхароў-забудоўшчыкаў пра адсутнасць заўваг па якасці выкананых будаўніча-мантажных работ. Арганізаваны «прамыя лініі» для зваротаў грамадзян. Летась за парушэнні пры будаўніцтве жылля да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута амаль 300 службовых асоб. Гомельскім, Светлагорскім і Мазырскім ДБК засвоена вытворчасць і нарошчваецца будаўніцтва жылых дамоў новых мадэрнізаваных серый. Прадпрыемствы будіндустрыі вобласці працуюць над абавязковай сертыфікацыяй прадукцыі ў адпаведнасці з нормамі Еўрасаюза. Аблвыканкам выйшаў на ўрад і Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва з ініцыятывай аб увядзенні на заканадаўчым узроўні механізму абавязковага страхавання рызык пры будаўніцтве жылля, які павінен прадугледжваць трохгадовы страхавы перыяд.

***— Якія меры вы, як прафесі

АТЫ-БАТЫ, ПРЭЧ ДЫСБАТЫ?

Парламенцкі дзённік

Лёс дысцыплінарных воінскіх часцей вырашаецца ў дэбатах паміж тэарэтыкамі і практыкамі

ПЕРНІК ці бізун — што больш дзейснае? Літасць ці бязлітаснасць — хто лепшы дарадца? Адвечная філасофская спрэчка. Якая ў маштабах дзяржавы, аднак, увасабляецца ў канкрэтныя факты, лічбы, тэндэнцыі. А галоўнае, у нормы права. Старажытныя заканадаўцы прытрымліваліся суровасці. Скраў? Адсекчы руку. Прабраўся ў чужы дом? Забіць. З тых часоў чалавецтва прайшло вялікі шлях гуманізацыі. Не цураецца яе і крымінальнае заканадаўства ва ўсім свеце. Скарачаюцца тэрміны пазбаўлення волі, уводзяцца альтэрнатыўныя пакаранні — штрафы ды папраўчыя работы. Падобныя змены зазнаў не так даўно і беларускі Крымінальны кодэкс. Аднак вайсковую сферу яны не закранулі. Праект «памякчальных» паправак, распрацаваны па ініцыятыве дэпутатаў камісіі па нацбяспецы, абмеркавалі днямі ў парламенце ўсе зацікаўленыя.

— Асноўная ідэя прапанаванага да разгляду законапраекта — выключэнне такога віду пакарання для вайскоўцаў тэрміновай ваеннай службы, як накіраванне ў дысцыплінарную воінскую часць, — кажа **Ігнацій МІСУРАГІН, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы**.

Папросту скасаванне такіх установ. Аргументаў у дэпутатаў — хоць адбаўляй. Яны называюць існаванне дысбатаў анахранізмам, перажыткам мінулага: іх, паводле звестак парламентарыяў, няма больш нідзе ў свеце. Ды і нашы перапоўненымі не назавеш. Такой статыстыкай дзеліцца спадар Місурагін: калі ў 1995 годзе там адбывала пакаранне больш за 350 чалавек, то летась — толькі 19. А пасля амністыі дык наогул шасцёра засталося. Толькі выдаткі на іх зусім не такія сціплыя. На 8-ы асобны дысцыплінарны батальён у Мінску (апошні з «магікан») штогод траціцца больш як 1,8 млрд рублёў. Не толькі неапраўданыя расходы хвалююць парламентарыяў. На думку старшыні камісіі, «інстытут дысцыплінарных батальёнаў не адпавядае новай структуры войска з улікам пераходу на кантрактную аснову і службу ў рэзерве». Ён і ў прынцыпе не адпавядае структуры войска: маўляў, выкананне пакаранняў не ўваходзіць у кампетэнцыю Узброеных Сіл, прычым у любой дзяржаве. Карацей, абараназдольнасць не забяспечвае, а грошы марнуе.

Погляды дэпутатаў падзяляюць практычна ўсе ўдзельнікі рабочай групы — прадстаўнікі абароннага і памежнага ведамстваў, судовай сістэмы. На паляпшэнне выхаваўчай работы і якасці адбору ў войска, а як вынік — зніжэнне злачыннасці, спасылаецца **намеснік міністра абароны Міхаіл ПУЗІКАЎ**. А паколькі ў дысбат трапляюць за парушэнні, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, здзейсненыя, як правіла, упершыню, для такіх асоб было б дастаткова, на яго думку, і больш мяккіх захадаў. Арышту, штрафу ці папраўчых работ, напрыклад. Аналагічных поглядаў прытрымліваецца і **Сяргей КУПРЫК, намеснік начальніка генштаба Узброеных Сіл**, які задаецца пытаннем: «Навошта дзяліць грамадзян на дзве катэгорыі?». Умоўна кажучы, студэнтам, якія паб'юцца, дадуць штраф, а вайскоўцу — «тэрмін». Неадпаведнасць нейкая атрымліваецца: за адну і тую ж правінаснасць пакаранне рознае. Лёс вінаватага турбуе войска і ў глабальным сэнсе — як страчаны кадр. Нягледзячы на тое, што дысбат з'яўляецца вайсковым падраздзяленнем, спецыяльнасці там не навучаюць. Адпаведна, адседзеўшы ў дысбаце, малады чалавек «страчвае навыкі і як спецыяліст асаблівай каштоўнасці не ўяўляе». Пазіцыя вайскоўцаў зразумелая, і яе падзяляюць практычна ўсе ўдзельнікі рабочай групы.

Практычна ўсе — гэта за выключэннем Навукова-практычнага цэнтра Генпракуратуры. Эксперты ставяць пад сумненне скасаванне дысбата. Іх пярэчанні датычацца не самога інстытута дысбатаў: «Размова не ідзе пра тое, што гэта ідэальны від пакарання», кажа **Мікалай БАБІЙ, намеснік дырэктара НПЦ**. Бянтэжыць іх адсутнасць адэкватнай альтэрнатывы. Папраўчыя работы адпадаюць — іх прызначаюць толькі працоўным. Штраф, на думку, экспертаў не стыкуецца з ключавым прынцыпам крымінальнага заканадаўства — асабістай вінаватай адказнасцю. Салдат, з яго мізэрным грашовым забеспячэннем, не ў стане заплаціць сам. Усім зразумела, што за яго гэта робяць бацькі. Арышт (які адбываецца вайскоўцамі на гаўптвахце) не задавольвае экспертаў несуразмернасцю: «Два гады пазбаўлення волі і тры месяцы на гаўптвахце — гэта розныя віды пакаранняў», — акцэнтуе ўвагу на гэтай неадпаведнасці спадар Бабій. Ён упэўнены, што вырашаць няпростае пытанне варта комплексна, сістэмна. А проста скасаваць наяўны від пакарання спецыялістам цэнтра ўяўляецца небяспечным на крыміналагічныя рызыкі.

— Для нас немалаважна, каб не было рэцыдываў, — звяртае ўвагу ўдзельнікаў рабочай групы **начальнік аддзела НПЦ Генеральнай пракуратуры Дзмітрый ШЫЛІН**.

У выпадку з дысцыплінарнай воінскай часцю, паводле яго звестак, рэцыдываў значна менш: у сярэднім 10 адсоткаў (для параўнання, агульны ўзровень рэцыдываў — прыкладна 50%).

Лагічнымі і досыць пераканаўчымі падаюцца аргументы абодвух бакоў, якія вядуць дыскусію. Ісціна, як заўжды, недзе пасярэдзіне. Але тое, што дысбат палохае салдат-тэрміноўшчыкаў больш, чым турма, пра нешта ды кажа...

Справа цяпер за малым: каб рабочая група прыйшла да кансенсусу. Тады можна чакаць унясення законапраекта ў парламент.

Дэпутаты ініцыююць і яшчэ адно змякчэнне — па славутым артыкуле пра нестатутныя адносіны. Дзейны Крымінальны кодэкс абяцае за іх да чатырох гадоў. Парламентарыі прапануюць зменшыць максімальны тэрмін удвая. Сваю пазіцыю яны абгрунтоўваюць наяўнасцю дыспрапорцыі паміж злачынствам і пакараннем.

— Нанясенне адным вайскоўцам другому аплявухі, штуршкоў, адзінкавых удараў, якія не выклікалі ніякіх наступстваў, утвараюць састаў злачынства, за здзяйсненне якога вінаваты можа быць пазбаўлены волі тэрмінам да чатырох гадоў, — бянтэжыцца Ігнацій Місурагін.

Ды і самі парушэнняў апошнім часам стала менш. Парламентарыі валодаюць інфармацыяй, што колькасць такіх злачынстваў за 2001—2009 гады зменшылася амаль утрая. Аднак цяжка верыцца ў тое, што кожны выпадак «дзедаўшчыны» даходзіць да суда... Як бы там ні было, чалавецтва нездарма рухаецца ў бок гуманізацыі. Пасунемся і мы.

Ала МАЧАЛАВА.

СЛУШНЫЯ РАШЭННІ

РАЗМОВЫ пра пастаўкі казахстанскай нафты ў Беларусь — досыць доўгая песня. Казахстан здабывае больш як 80 млн тон чорнага багацця ў год. Да 2020 года разлічваюць выйсці на ўзровень 130 млн тон. Так што, магчымасцяў пастаўкі, у тым ліку і ў Беларусь, хапае. Справа за канкрэтнымі дамоўленасцямі.

— Беларускім бокам распрацаваны праект пагаднення па супрацоўніцтве ў галіне паставак нафты ў Беларусь, ён цяпер разглядаецца ў Казахстане, — паведаміў на сустрэчы з журналістамі **пасол Казахстана ў Беларусі Анатоль СМІРНОЎ**.

Ён увязвае магчымасць паставак з Адзінай эканамічнай прасторай. Пры яе наяўнасці ўсе нюансы паставак будуць узгадняцца ў тройцы. На думку дыпламата, рашэнне гэтага пытання магчымае налета. Слушнае, спадзяёмся.

Куды больш блізкая перспектыва — пазачарговыя выбары прэзідэнта Казахстана. Яны адбудуцца ўжо зусім хутка — трэцяга красавіка. Выказаць сваё рашэнне змогуць і грамадзяне гэтай краіны, якія знаходзяцца ў Беларусі. Выбарчы ўчастак будзе адкрыты ў пасольстве з 7 да 20 гадзін. Маніторынгам выбараў у Казахстане зоймецца шырокае кола міжнародных назіральнікаў. Як паведаміў пасол, іх ужо акрэдытавана больш за тысячу. Самыя прадстаўнічыя місіі, натуральна, ад СНД і АБСЕ. Сярод назіральнікаў, зразумела, будуць і беларусы.

У нашым двухбаковым узаемадзеянні дыпламат назваў прыярытэтным супрацоўніцтва з БелАЗам. Каля 1,8 тыс. машын ужо працуе на казахстанскіх землях. Прычым ідзе пастаўка не толькі тэхнікі, але і дэталяў — зборка, напрыклад, наладжаная ў Карагандзінскай вобласці.

— Мы настойваем на тым, каб ствараліся сэрвісныя цэнтры па абслугоўванні беларускай тэхнікі ў Казахстане, — акцэнтуе дыпламат.

На тэрыторыі яго краіны арганізавана больш за 80 сумесных прадпрыемстваў з Беларуссю. Казахстан зацікаўлены супрацоўнічаць з нашай краінай у перапрацоўчай прамысловасці, машынабудаўніцтве. Там ідзе зборка камбайнаў, трактароў і ліфтаў айчыннай вытворчасці. На нашым баку казахстанскі бок пакуль прадстаўлены не так шырока, але перспектывы ёсць. У беларускай сталіцы ўжо будуецца пяцізоркавы атэль, а таксама вядуцца перамовы наконт узвядзення забаўляльнага цэнтра і жылога мікрараёна.

Трагедыя ў Японіі, народ якой з нехарактэрнай для такой сітуацыі годнасцю вытрымлівае жахлівыя выпрабаванні, змушае пераглядаць сітуацыю ва ўсіх краінах. Галоўны ўрок, які выносіць казахстанскі дыпламат — «трэба мадэрнізаваць своечасова ўсе прадпрыемствы, не толькі АЭС». Ды наогул працаваць на найноўшым абсталяванні, выкарыстоўваць найноўшыя тэхналогіі.

— Слушнае рашэнне прынятае ў Беларусі, — рэзюмуе казахстанскі дыпламат, — з дапамогай Расійскай Федэрацыі будаваць АЭС.

І ў Казахстане, пераканаўся спадар Смірноў, наяўны праект узвядзення АЭС будзе мець свой працяг.

Ала МАЧАЛАВА.

БРСМ: Беларусь стала ахвярай беспрэцэдэнтнай па сваёй цынічнасці хлусні

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі выступіў з адкрытым зваротам да грамадскіх і палітычных дзеячаў у сувязі з міжнароднай сітуацыяй, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Як гаворыцца ў звароце, апублікаваным на афіцыйным сайце самай масавай беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі, «на працягу апошніх чатырох месяцаў наша краіна стала ахвярай беспрэцэдэнтнай па сваёй інтэнсіўнасці і цынічнасці кампаніі хлусні, паклёпу, шантажу, палітычнага, дыпламатычнага і эканамічнага націску». Прадстаўнікі шэрагу замежных краін, а таксама структур Еўрасаюза, не маючы дакладнай інфармацыі аб падзеях, якія адбываліся ў Мінску 19 снежня 2010 года, зрабілі адназначную выснову пра быццам бы фальсіфікацыю вынікаў галасавання, а таксама празмернага прымянення сілы супраць тых, хто сабраўся на так званую выключна мірную акцыю дэманстрантаў. Менавіта гэтыя вывады сталі падставай для цкавання Беларусі з боку інстытутаў і палітыкаў Еўрасаюза, якія ў духу халоднай вайны ўводзяць неправамерныя візавыя, эканамічныя і іншыя абмежаванні правоў беларускіх грамадзян.

Аднак ніхто не звярнуў увагу на незаконны характар названай дэманстрацыі. Чамусьці не была дадзена міжнародная ацэнка правакацыйным і як мінімум хуліганскім дзеянням удзельнікаў гэтай акцыі, якія, акрамя парушэння грамадскага парадку, арганізавалі напад на будынак, дзе размяшчаюцца беларускі ўрад, парламент, Цэнтральная выбарчая камісія.

Пры гэтым «якім жа было наша здзіўленне, калі ў іншай сітуацыі, 27 сакавіка 2011 года ў Лондане, урад Вялікабрытаніі прымяніў сілу для падтрымання грамадскага парадку, у выніку чаго пацярпелі 38 чалавек, а больш за 200 былі арыштаваны», адзначаецца ў звароце. Моладзь Беларусі здзіўлена, наколькі адрозніў была рэакцыя краін Захаду. «Ніводнага слова асуджэння з боку міжнародных інстытутаў і праваахоўных арганізацый. Ніводнай негатыўнай ацэнкі дзеянняў улад. Ніякіх наступстваў!» — гаворыцца ў дакументе.

У якасці яшчэ аднаго прыкладу прадстаўнікі БРСМ прыводзяць цяперашнюю сітуацыю ў Лівіі. «У парушэнне палажэнняў Дэкларацыі аб устанаўленні фактаў ААН 1991 года, не маючы поўнай інфармацыі, не прыводзячы аб'ектыўнага вывучэння сітуацыі, Савет Бяспекі ААН прымае рашэнне, санкцыніруючае прымяненне сілы супраць суверэннай дзяржавы, члена ААН — Лівіі», — сказана ў звароце.

«Мы верым у тое, што абсурдная сітуацыя, якая склалася вакол Беларусі, будзе перагледжана з улікам усіх акалічнасцяў, устаноўленых на сёння. Упэўнены, гэта хутка прывядзе да адмены санкцый, нармалізацыі адносін Беларусі, Еўрасаюза і ЗША і ўмацавання міжнароднай бяспекі», — падкрэслівае беларуская моладзь.

Сярод адрасатаў, каму быў накіраваны зварот, — вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан, старшыня Еўракамісіі Жазэ Мануэль Барозу, прэзідэнты ЗША Барак Абама і Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў, міністр замежных спраў Германіі Гіда Вестэрвеле, дзяржаўны сакратар ЗША Хілары Клінтан, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран, міністры замежных спраў Швецыі, Чэхіі, Польшчы і іншыя. У спіс адрасатаў таксама ўвайшлі вядучыя сусветныя і еўрапейскія СМІ.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне сваю працу 4 красавіка 2011 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **4 красавіка 2011 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

4 красавіка 2011 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

Приорбанк RZB Group

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
ул. В.Хоружей, 31А, г. Минск

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		333 203,2	266 722,2
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	3.1	1 583,9	1 107,1
4	Средства в Национальном банке	1103	3.2	507 458,2	209 683,3
5	Средства в банках	1104	3.3	571 633,4	569 617,3
6	Ценные бумаги	1105	3.4	0,0	53 652,1
7	Кредиты клиентам	1106	3.5	4 134 989,0	3 642 595,4
8	Производные финансовые активы	1107	3.10	45 736,9	43 841,8
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	3.6	9 736,4	9 736,4
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	3.7	292 496,8	231 109,9
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	3.8	152,2	175,3
12	Прочие активы	1111	3.9	64 680,6	51 503,1
13	**ИТОГО активы**	**11**		**5 961 670,6**	**5 079 743,9**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201	3.11	119 679,1	7 412,4
16	Средства банков	1202	3.12	1 194 629,3	1 429 035,2
17	Средства клиентов	1203	3.13	3 472 222,2	2 625 390,9
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	3.14	153 502,7	140 058,5
19	Производные финансовые обязательства	1205	3.10	13 738,4	10 769,7
20	Прочие обязательства	1206	3.9	56 844,8	85 205,5
21	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**5 010 616,5**	**4 297 872,2**
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		412 279,3	412 279,3
24	Эмиссионный доход	1212		0,0	0,0
25	Резервный фонд	1213	3.15.2	107 616,0	62 008,8
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		116 780,5	92 285,3
27	Накопленная прибыль	1215		314 378,3	215 298,3
28	Всего капитал	121	3.15.1	951 054,1	781 871,7
29	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**5 961 670,6**	**5 079 743,9**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2010 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
ул. В.Хоружей, 31А, г. Минск

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		581 228,0	539 950,5
2	Процентные расходы	2012		269 873,3	318 387,1
3	Чистые процентные доходы	201	3.17	311 354,7	221 563,4
4	Комиссионные доходы	2021		295 242,6	235 550,6
5	Комиссионные расходы	2022		41 717,1	39 060,3
6	Чистые комиссионные доходы	202	3.18	253 525,5	196 490,3
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		204,1	52,9
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	3.19	(446,1)	7 409,1
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	3.20	109 462,9	76 849,6
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	3.21	(41 122,1)	62 627,5
11	Чистые отчисления в резервы	207	3.22	87 523,8	106 635,0
12	Прочие доходы	208	3.23	52 968,3	29 609,3
13	Операционные расходы	209	3.24	238 929,1	210 970,5
14	Прочие расходы	210		48 824,8	40 470,8
15	Прибыль до налогообложения	211		310 669,6	236 525,8
16	Налог на прибыль	212		80 440,1	65 311,6
17	**ПРИБЫЛЬ**	**2**		**230 229,5**	**171 214,2**

Базовая прибыль на простую акцию	1 870,8	1 391,2
Разводненная прибыль на простую акцию	1 870,8	1 391,2

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2010 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
ул. В.Хоружей, 31А, г. Минск

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование показателей	Символ	Наименование статей капитала					
			Уставный фонд	Эмиссионный доход	Резервный фонд	Накопленная прибыль (убыток)	Фонды переоценки статей баланса	Всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
Раздел I. За год, предшествующий отчетному								
1	Остаток на 1 января 2009 г.	3011	412 279,2	0,0	43 508,8	97 426,4	87 722,4	640 936,8
2	Изменения статей капитала	3012	0,1	0,0	18 500,0	117 871,9	4 562,9	140 934,9
2.1	В том числе: совокупный доход	30121	x	x	x	171 214,2	6 767,3	177 981,5
2.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	0,0	x	18 500,0	(18 500,0)	x	0,0
2.3	операции с учредителями (участниками):	30123	0,0	0,0	x	(34 842,3)	x	(34 842,3)
2.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	0,0	0,0	x	x	x	0,0
2.5	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	(34 842,3)	x	(34 842,3)
2.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233	0,0	x	x	x	x	0,0
2.7	перераспределение между статьями капитала	30125	0,1	0,0	0,0	0,0	0,0	0,1
2.8	прочие изменения	30126	0,0	0,0	0,0	0,0	(2 204,4)	(2 204,4)
3	Остаток на 1 января 2010 г.	3013	412 279,3	0,0	62 008,8	215 298,3	92 285,3	781 871,7
Раздел II. За отчетный год								
4	Остаток на 1 января 2010 г.	3011	412 279,3	0,0	62 008,8	215 298,3	92 285,3	781 871,7
5	Изменения статей капитала	3012	0,0	0,0	45 607,2	99 080,0	24 495,2	169 182,4
5.1	В том числе: совокупный доход	30121	x	x	x	230 229,5	24 487,0	254 716,5
5.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	0,0	x	45 607,2	(45 607,2)	x	0,0
5.3	операции с учредителями (участниками):	30123	0,0	0,0	x	(85 542,3)	x	(85 542,3)
5.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	0,0	0,0	x	x	x	0,0
5.5	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x	(85 542,3)	x	(85 542,3)
5.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233	0,0	x	x	x	x	0,0
5.7	перераспределение между статьями капитала	30125	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0	0,0
5.8	прочие изменения	30126	0,0	0,0	0,0	0,0	8,2	8,2
6	Остаток на 1 января 2011 г.	3013	412 279,3	0,0	107 616,0	314 378,3	116 780,5	951 054,1

СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2010 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
ул. В.Хоружей, 31А, г. Минск

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	Прибыль за отчетный период	301211		230 229,5	171 214,2
2	Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период	301212		24 487,0	6 767,3
2.1	В том числе: переоценка основных средств	3012121	3.7.1	22 854,9	6 464,9
2.2	переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования	3012122	3.7.1	1 632,1	302,4
2.3	переоценка ценных бумаг	3012123			0,0
2.4	переоценка инструментов хеджирования	3012124			0,0
2.5	переоценка прочих статей баланса	3012125			0,0
3	ИТОГО совокупный доход за отчетный период	30121		254 716,5	177 981,5

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2010 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
ул. В.Хоружей, 31А, г. Минск

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1.	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
2.	Полученные процентные доходы	70100		542 281,0	539 950,5
3.	Уплаченные процентные расходы	70101		(269 014,1)	(322 866,4)
4.	Полученные комиссионные доходы	70102		279 549,1	235 552,7
5.	Уплаченные комиссионные расходы	70103		(41 264,3)	(40 440,4)
6.	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	70104		204,1	52,9
7.	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	70105		(446,1)	7 409,1
8.	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	70106		44 351,6	59 640,4
9.	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	70107		(43 017,3)	20 183,2
10.	Прочие полученные доходы	70108		47 633,9	24 377,5
11.	Прочие уплаченные расходы	70109		(252 139,5)	(225 449,9)
12.	Уплаченный налог на прибыль	70110		(78 430,1)	(63 578,1)
13.	Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого	701		229 708,3	234 831,5
14.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	70200		36 001,9	30 739,0
15.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках	70201		62 665,9	58 877,2
16.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения)	70202		45 161,9	(4 305,4)
17.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	70203		(426 952,6)	642 848,8
18.	Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов	70204		0,0	0,0
19.	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	70205		(117 744,5)	29 859,7
20.	Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого	702		(400 867,4)	758 019,3
21.	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	70300		112 100,0	(955,0)
22.	Чистый прирост (снижение) денежных средств банков	70301		(189 649,5)	(1 002 931,6)
23.	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	70302		959 059,3	(37 379,0)
24.	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	70303		15 334,0	65 174,7
25.	Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств	70304		3 063,8	(7 451,3)
26.	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	70305		(124 455,5)	(26 635,0)
27.	Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого	703		775 452,1	(1 010 177,2)
28.	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		604 293,0	(17 326,4)
29.	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
30.	Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71100		(67 181,7)	(66 123,0)
31.	Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71101		4 387,3	5 161,9
32.	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71102		0,0	(2 000,0)
33.	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71103		375,2	0,0
34.	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71104		0,0	(23 157,4)
35.	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71105		0,0	40 672,2
36.	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		(62 419,2)	(45 446,3)
37.	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
38.	Эмиссия акций	72100		0,0	0,0
39.	Выкуп собственных акций	72101		0,0	0,0
40.	Продажа ранее выкупленных собственных акций	72102		0,0	0,0
41.	Выплата дивидендов	72103		(85 424,0)	(34 808,1)
42.	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72		(85 424,0)	(34 808,1)
43.	Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты	73		2 126,3	101 172,7
44.	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74		458 576,1	3 591,9
45.	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740		x	533 811,1
46.	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741		992 387,2	x

Председатель Правления Костюченко С.А.
Главный бухгалтер Манцивода В.В.
Директор ИООО «Эрнст энд Янг» Лащенко П.А.
Дата подписания 21 февраля 2011 г.

ИООО «Эрнст энд Янг»
Республика Беларусь, 220004, г. Минск,
ул. Короля, 51, 2 этаж, офис 30.
Тел.: +375 (17) 209 4535
Факс: +375 (17) 209 4534

Аудиторское заключение независимой аудиторской организации ИООО «Эрнст энд Янг» по годовой публикуемой финансовой отчетности «Приорбанк» ОАО, подготовленной по итогам деятельности за 2010 год

Акционерам, Наблюдательному совету и Исполнительному комитету «Приорбанк» ОАО

Мы провели аудит бухгалтерского баланса «Приорбанк» ОАО (далее «Банк») на 1 января 2011 года, соответствующих отчетов о прибыли и убытках, об изменении капитала и о движении денежных средств за год по указанную дату (далее «отчетные формы»). Данные отчетные формы составлены на основании годового отчета Банка с целью их обязательной публикации. Годовой отчет был подготовлен руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», «Инструкцией по ведению бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года № 283 с изменениями и дополнениями, «Инструкцией по составлению годового отчета банками Республики Беларусь», утвержденной постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 27 ноября 2006 года № 323 с изменениями и дополнениями, и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

Ответственность руководства

Ответственность за подготовку и представление годового отчета и прилагаемых отчетных форм в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности несет руководство Банка. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверного годового отчета и прилагаемых отчетных форм, не содержащих существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики; определение обоснованных оценочных значений.

Ответственность аудиторской организации

Наша обязанность заключается в том, чтобы на основе проведенного аудита выразить мнение о достоверности данных отчетных форм.
Мы руководствовались требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 8 ноября 1994 года № 3373-XII и провели аудит в соответствии с Правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность в отсутствии существенного искажения в прилагаемых отчетных формах.
Аудит включает выполнение процедур, направленных на получение аудиторских доказательств в отношении сумм и информации, представленных в отчетных формах. Выбор процедур основывается на суждении аудитора, включая оценку риска существенного искажения отчетных форм вследствие ошибок или недобросовестных действий. При оценке этого риска аудитор рассматривает аспекты внутреннего контроля в отношении подготовки и достоверного представления отчетных форм с тем, чтобы определить процедуры аудита, необходимые в конкретных обстоятельствах, а не для выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает оценку уместности выбранной учетной политики и обоснованности бухгалтерских оценок, сделанных руководством Банка, и оценку представления отчетных форм в целом.
Мы считаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими для выражения нашего мнения.

Аудиторское мнение

По нашему мнению, прилагаемые отчетные формы, составленные на основании годового отчета Банка, достоверно, во всех существенных аспектах, отражают финансовое положение Банка по состоянию на 1 января 2011 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денеж

ЛОГІКА і станоўчая дынаміка развіцця эканамічных адносін паміж Беларуссю, Расіяй і Казахстанам няўмольна падвядзе іх да высновы аб стварэнні адзінай валюты. Гэтая думка належыць вядомаму беларускаму эканамісту, члену Грамадска-кансультацыйнага Савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Л.Ф. Заіку. Наш карэспандэнт папрасіў яго ўдакладніць сваю пазіцыю.

АДЗІНАЯ ПРАСТОРА — АДЗІНЫЯ ГРОШЫ. РУБЕЛЬ. АЛЕ НЕ РАСІЙСКІ, А САЮЗНЫ

— Леанід Фёдаравіч, на чым заснавана ваша ўпэўненасць у неабходнасці пераходу ў недалёкай будучыні ад Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана да іх валютнага саюза пасля стварэння імі паўнацэннай Адзінай эканамічнай прасторы?

— На вывучэнні сусветнага досведу развіцця розных эканамічных інтэграцый. Іх гісторыя мае агульныя рысы. Кожная інтэграцыя на шляху станаўлення праходзіць некалькі фаз. Першая: зона свабоднага гандлю. Выканалі яе задачы — ідуць далей. Другая фаза: мытны саюз. Выканалі пастаўленыя мэты — рухаюцца далей. Трэцяя фаза: валютны саюз. Выкананнем гэтай задачы завяршаецца ў асноўным стварэнне інтэграцыі. Наколькі я ведаю з адкрытых крыніц інфармацыі, лідары Беларусі, Расіі і Казахстана пацвердзілі намер стварыць інтэграцыю ў поўным аб'ёме пад назвай Адзіная эканамічная прастора. А калі краіны інтэгрыруюцца, то ўзнікаюць узаемныя інтарэсы літаральна ва ўсіх сферах. Агульная валюта, мушу заўважыць, для нас, Беларусі, зусім нядрэнная перспектыва ў гэтай інтэграцыі. Бо з часам застанецца ўсяго некалькі валют, так бы мовіць, сусветнага значэння: долар ЗША, кітайскі юань, японская іена, зразумела, валюта Еўрасаюза. І швейцарскі франк у якасці выключэння з правілаў. Бадай, і ўсё. А вось для такіх краін, як Беларусь, Украіна, Арменія, Казахстан і многіх іншых пераход на агульныя інтэграцыйныя грошы стаў бы сродкам вырашэння важных валютна-фінансавых праблем.

— Што датычыць нашага Мытнага саюза, то што гэта за грошы могуць быць? Новая валюта з новай назвай ці расійскі рубель, якому Масква ўпарта імкнецца надаць статус рэгіянальнай валюты?

— Я думаю, што, хутчэй за ўсё, захаваецца гістарычная назва: «рубель». Але гэта будзе не расійскі рубель, а саюзны рубель. Магчыма, для надання значнасці новай валюце можна будзе пайсці на дэнамінацыю грашовых адзінак «тройкі». Скажам, з беларускага рубля ўбраць тры, а лепш чатыры нулі. Дэнамінаваць таксама расійскія і казахстанскія грошы, каб адзін амерыканскі долар, напрыклад, каштаваў 30 капеек новага саюзнага рубля. Такія суадносіны долара ЗША і валюты краін Мытнага саюза, які валодае вялізарнымі золата-валютнымі рэзервамі, запасамі разнастайных прыродных выкапняў, у тым ліку нафты і газу, былі б разумныя і адэкватныя. Увогуле, на мой погляд, цяперашнія суадносіны расійскага рубля і долара ЗША як 1:30 — гэта сур'ёзны пралік былых дарадцаў-эканамістаў прэзідэнта Б.М. Ельцына.

— Што трэба зрабіць, каб надаць моц будучай інтэграцыйнай валюце?

— Асноўная ўмова — новы рубель павінен мець залаты стандарт. Золата ў Расіі, Казахстана і Беларусі шмат. Залаты стандарт дапаможа ім надзейна ўтаймаваць інфляцыю. Бо ўзнікае пытанне: што гэта за інтэграцыя, краіны якой разлікі вядуць у амерыканскіх даларах? Колькі можна? Ды і на бытавым узроўні таксама трэба скарэктаваць разлікі. Працоўная міграцыя ў межах Беларусі, Расіі і Казахстана будзе і надалей пашырацца. І што, зароблены там беларусамі немалыя грошы ў нацыянальнай валюце мяняць на долары ці еўра, а затым дома на беларускія рублі? Стратны працэс.

Так, знойдзена трывалая аснова для эфектыўнага эканамічнага ўзаемадзеяння Беларусі, Расіі і Казахстана — капіталы, банкі, грошы. Гэтыя складнікі інтэграцыі дазволяць сфарміраваць магутны міжнародны фінансавы цэнтр, які будзе абслугоўваць рынак свабоднага руху тавараў, капіталаў і працоўнай сілы. Палітыкі трох дзяржаў ужо разумеюць, што цэментаваць канструкцыю Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы будуць узаемныя інвестыцыі, супрацоўніцтва бізнэсу. Але і гэты працэс пойдзе хутчэй, калі гэта будзе адзіная валюта.

— Яшчэ зусім нядаўна па гістарычных мерках урад на чале з В. Кебічам, у склад якога, дарэчы, уваходзіў цяперашні кіраўнік урада, актыўна выступаў за «аб'яднанне грашовых сістэм Беларусі і Расіі». Тады гэты варыянт не прайшоў. Чаму?

Можна было б паспрабаваць пайсці па шляху кваціравання імпарту на патрыманыя іншамаркі ў краіны Мытнага саюза. Скажам, у першы год завезці не больш за 100 тысяч машын без абкладання пошлінай, у наступны 70 тысяч, а надалей яго зусім супыніць.

— На той час не паспелі аб'ектыўныя ўмовы для такога адказнага кроку. Не была праведзена належная работа і па стварэнні зоны свабоднага гандлю, і мытнага саюза, затое ўсё больш стагналі і лілі слёзы з выпадку «разрыву па-жывому» былых гаспадарчых сувязяў, заклікалі да іх аднаўлення і г. д. Было ў гэтым больш палітычнай прапаганды, чым канкрэтнай эканамічнай інтэграцыі. Мне тая дзейнасць нагадвала спробы пачаць пабудаваць дом з даху, а не з фундамента. Зараз непараўнальна больш спрыяльныя абставіны. Эканомікі «тройкі» ўжо трывала сталі на рынкавыя рэйкі, яе краіны прайшлі складаны, а часам цярністы шлях да глыбокага асэнсавання пераваг інтэграцыі. А таму і добра, што ў шаноўных Вячаслава Францавіча Кебіча і Барыса Мікалаевіча Ельцына нічога не атрымалася з «аб'яднаннем грашовых сістэм Беларусі і Расіі». Усё роўна плёну не было б.

— Затым была эпапея па пераходзе на адзіную валюту. Меркавалася, што расійскі рубель павінен быў стаць адзіным аплатным сродкам яшчэ ў 2005 годзе. Зноў не атрымалася. Што перашкодзіла?

— Сур'ёзныя асцярогі беларускага ўрада ў верагоднай страце значнай часткі нацыянальнага суверэнітэту. Прычыны для такіх хваляванняў былі. Спрэчкі на гэтую тэму тады паставілі крыж на ўвядзенні расійскага рубля як адзінай грашовай адзінкі Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі.

— Не будзем паглыбляцца ў гісторыю пытання. А скажыце, дзе, на ваш погляд, мог бы размяшчацца эмісійны цэнтр агульнай валюты краін Адзінай эканамічнай прасторы?

— Спачатку трэба стварыць Інтэграцыйны банк, які б выпускаў новую грашовую адзінку, ці прасцей кажучы, друкаваў яе. Паўнапраўнымі ўдзельнікамі банка сталі б Цэнтральны банк Расіі, нацыянальныя банкі Беларусі і Казахстана. Эмісійны цэнтр, дарэчы, можна было б размясціць у Мінску, каб не перагружаць інтэграцыйнымі клопатамі Маскву. А ў ёй і ў Астане адкрыць структурныя падраздзяленні Інтэграцыйнага банка.

Вы, відаць, заўважылі, што з'явіліся новыя гульцы на прасцягах Мытнага саюза, якія ўсё актыўней заяўляюць пра сябе. Я маю на ўвазе магутныя расійскія банкі: ВТБ, Ашчадны банк і іншыя. Яны ўжо здольныя фінансаваць буйныя эканамічныя праекты, укладваць значныя нават па сусветных маштабах інвестыцыі ў развіццё цэлых галін эканомікі. Сёння такія банкі самі шукаюць выгадныя праекты — тэхналагічныя, будаўнічыя, фармацэўтычныя, транспартныя, сацыяльныя — для ўкладання сродкаў. Ужо сёння Беларусі становіцца выгадней выкарыстоўваць інвестыцыйны патэнцыял расійскіх банкаў, чым замежных, — скажам, Еўрапейскага банка развіцця і рэканструкцыі. А ў будучыні гэтыя перавагі для Беларусі стануць яшчэ больш важкімі. Бо ў межах «тройкі», нагадаю, будзе існаваць вялікі рынак свабоднага руху тавараў, працоўнай сілы і капіталаў.

— Але зараз большасць насельніцтва нашай краіны па-ранейшаму заклапочана няўмольным павышэннем з 1 ліпеня г.г. цэн на патрыманыя іншамаркі. Здаецца, аўтамабільнае пытанне можа надоўга сапсаваць настрой значнай часткі насельніцтва, якое стварыла сітуацыю ажыятажнага попыту каля абменных пунктаў валюты. Няўжо нельга мінімізаваць негатыўныя наступствы росту цэн на іншамаркі?

— Мы з вамі нядаўна абмяркоўвалі гэтую тэму. Я разумею, што словамі гору патэнцыйных аўтаўладальнікаў не дапаможаш, а таму прапаноўваю не спяшацца з аднаразовым павышэннем цэн на патрыманыя іншамаркі. Можна было б паспрабаваць пайсці па шляху кваціравання імпарту такіх машын у краіны Мытнага саюза. Скажам, у першы год завезці не больш за 100 тысяч аўтамабіляў без абкладання пошлінай, у наступны 70 тысяч, а надалей паступова і зусім супыніць такі імпарт. Ёсць іншыя прапановы? Давайце абмяркоўваць. Бо ўсе акцыі з рэзкім павышэннем цэн, чым бы яны ні былі абумоўленыя, заўсёды выклікаюць моцную адмоўную рэакцыю насельніцтва. Яна ўжо негатыўна адбілася на стане беларускага рубля, бо людзі і па прычыне «аўтамабільнага пытання» таксама сталі запасацца «зялёнай» валютай. Наколькі я ведаю, нават чыноўнікі высокага рангу кінуліся здымаць свае валютныя ўклады, пераводзіць рублёвыя дэпазіты ў долары і еўра, каб набыць машыну па цяперашніх цэнах. У выніку нашы банкі застаюцца без валюты. А тут яшчэ чуткі аб маючай адбыцца дэвальвацыі. Таму, на мой погляд, ёсць сэнс кіраўнікам урадаў Беларусі, Расіі і Казахстана яшчэ раз вярнуцца да гэтага, як сёння гаворыць расіяне, «чувствительного» пытання, якое было ўзнята па іх ініцыятыве. Так, расіяне абараняюць свой рынак, але чаму з-за гэтага павінна цярпець Беларусь і яе жыхары?

— У Расіі для сваіх грамадзян гэтую горкую пілюлю падсаладзілі — аб'явілі працяг кампаніі па заахвочванні здачы на ўтыль старых аўтамабіляў узамен на набыццё новага «жалезнага сябра» расійскай зборкі. Ці ёсць шанцы нейкім чынам і нам далучыцца да гэтай акцыі?

— У асноўным пакуль тэарэтычныя. Бо ў гэтай кампаніі задзейнічаны бюджэтныя сродкі Расійскай Федэрацыі. Хаця з іншага боку, можна было улічыць інтарэсы хаця б тых беларусаў, якія цяпер працуюць у Расіі і на Расію. Іх там, як нядаўна казалі мне ў Маскве расійскія эканамісты, амаль 1200 тысяч чалавек. Мне гэта лічба здаецца перабольшанай, але не ў яе памерах справа. Расія магла б пайсці насустрач, улічваючы станоўчы ўплыў на яе эканоміку беларускай працоўнай міграцыі. Увогуле, я лічу, што працоўная міграцыя ў межах Беларусі, Расіі і Казахстана будзе і надалей расці. Перспектыўнымі для нашых кваліфікаваных будаўнікоў, рабочых, інжынераў, навуковых спецыялістаў можа стаць узвядзенне трансгранічных транспартных калідораў паміж Еўропай і Азіяй, алімпійскіх аб'ектаў у Сочы, новых прамысловых прадпрыемстваў Казахстана. А таму ёсць сэнс кіраўнікам урадаў разам шукаць шляхі вырашэння складаных праблем, якія ўзнікаюць.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ТРАНСПАРТНЫ КАНТРОЛЬ НА БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЙ ГРАНІЦЫ АДМЯНЯЕЦЦА З 1 КРАСАВІКА

Транспартны кантроль на беларуска-расійскай граніцы з 1 красавіка перастане дзейнічаць і будзе перанесены на знешні контур Мытнага саюза, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік упраўлення транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі Павел Стасевіч.

Кантроль транспарту будзе зняты на ўсіх аўтамабільных пунктах пропуску, размешчаных на граніцы Беларусі і Расіі. «Гэта значыць, што на беларуска-расійскай граніцы не будуць больш надглядаць машыны», — адзначыў субяседнік.

Беларусь і Расія будуць ажыццяўляць узгодненыя дзеянні па транспартным кантролі ўжо на знешняй граніцы Саюзнай дзяржавы. «Краінамі ўзгоднены неабходныя параметры, якія датычацца таго, што неабходна правяраць на знешняй граніцы, — расказаў Павел Стасевіч. — З 1 красавіка беларуская транспартная інспекцыя на граніцы будзе выконваць дзеянні ў інтарэсах Расіі». Беларускія спецыялісты, у прыватнасці, будуць правяраць наяўнасць у перавозчыкаў, што едуць у Расію, расійскіх дазволаў, вагавыя параметры аўтатранспарту ў адпаведнасці з расійскімі нормамі. Будзе таксама правярацца наяўнасць дазволаў на перавозку небяспечных грузаў і дазволаў на праезд цяжкавагавых і буйнагабарытных транспартных сродкаў.

ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна № 1»

Учетный номер плательщика: **УНП 200215539**
Вид деятельности: **строительство**
Организационно-правовая форма: **частная**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **224025, г. Брест, ул. Белорусская, 51**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2010 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	3 025	4 635
амортизация	102	883	1 604
остаточная стоимость	110	2 142	3 031
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	1	1
амортизация	112		-
остаточная стоимость	120	1	1
Доходные вложения в материальные ценности:			
первоначальная стоимость	121	-	-
амортизация	122	-	-
остаточная стоимость	130	-	-
Вложения во внеоборотные активы	140		-
В том числе: незавершенное строительство	141	-	-
Прочие внеоборотные активы	150	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**2 143**	**3 032**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	892	1 446
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	763	944
животные на выращивании и откорме	212	-	-
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	51	300
расходы на реализацию	214	-	-
готовая продукция и товары для реализации	215	-	-
товары отгруженные	216	-	-
выполненные этапы по незавершенным работам	217	-	-
расходы будущих периодов	218	78	202
прочие запасы и затраты	219	-	-
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	-	
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230	-	-
В том числе: покупателей и заказчиков	231		-
прочая дебиторская задолженность	232		-
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	2 834	3 449
В том числе: покупателей и заказчиков	241	2 419	3 086
поставщиков и подрядчиков	242	337	294
по налогам и сборам	243	45	
по расчетам с персоналом	244	4	5
разных дебиторов	245	29	64
прочая дебиторская задолженность	249	-	-
Расчеты с учредителями	250	-	-
В том числе: по вкладам в уставный фонд	251	-	-
прочие	252	-	-
Денежные средства	260	244	53
В том числе: денежные средства на депозитных счетах	261	-	-
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Внереализационные доходы	140	1
Внереализационные расходы	150	490
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов	**160**	**-489**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	**200**	**711**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	490
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения	**240**	**1 201**
Налог на прибыль	250	273
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	28
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	**300**	**410**

Количество акционеров – всего **71** , в том числе юридических лиц – **1**, физических лиц – **70**.

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого год
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	167,78	0
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	967,73	0
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	7,867	6,679

ИНФОРМАЦИЯ О ЗАДОЛЖЕННОСТИ:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	187	99

Среднесписочная численность работающих (человек) – 86.

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: геологическая разведка недр, топографо-геодезическая деятельность.

Директор Общества **Г.П. Микишко**

Главныйбухгалтер **Н.А. Борисенко**

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «МОНТАЖЛЕГМАШ»

Адрес: 212030, г. Могилев, Славгородское шоссе, 173

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011г.

млн.руб.

АКТИВ	Код строк	На начало года	На конец года
I.ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ	190	1073	1217
II.ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ	290	817	1051
БАЛАНС (190+290)	300	**1890**	**2268**
ПАССИВ			
III.КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ	490	1814	2004
V.КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	690	76	264
БАЛАНС (490+590+690)	700	**1890**	**2268**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

с 1 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г. млн.руб.

Наименование показателя	Код строк	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	010	2202	1991
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	2135	1993
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	070	**67**	**-2**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	**7**	**16**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	**- 38**	**-**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200±210-220)	240	**36**	**14**
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	300	**2**	**1**

Дополнительная информация:
Количество акционеров – всего **35**, в том числе юридических лиц – **нет**, физических лиц – **35**.

Информация о дивидендах и акциях (только в составе годового отчета):

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн.руб.	-	-
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб.	1924	2125
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	-	-
Просроченная дебиторская задолженность	млн.руб.	-	-
Просроченная кредиторская задолженность	млн.руб.	-	-

Достоверность бухгалтерской (финансовой) отчетности подтверждена аудитором ИП Клинцовой Г.И., лиц. № 02200/0061988 с 20.04.2010 г. по 23.05.2015 г., выд. Минфином.
Среднесписочная численность работающих (человек) ____56_____.
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: 45252 – Монтаж металлических строительных конструкций зданий и сооружений.

Директор **А.С. Чернюк**

Главный бухгалтер **В.Е. Кличевская** *УНП 700099371*

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

«Минский экспериментально-фурнитурный завод»

Адрес: г. Минск, ул. Старовиленская, 100, т./факс: 334 96 54.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 года

Наименование статьи	В миллионах белорусских рублей
Внеоборотные активы	
Основные средства	19969
Нематериальные активы	128
Вложения во внеоборотные активы	337
Оборотные активы	
Запасы и затраты	4507
Налоги по приобретенным ценностям	375
Дебиторская задолженность	363
Денежные средства	6883
Финансовые вложения	2
Баланс	32564
Капитал и резервы	
Уставный фонд	7061
Добавочный фонд	7045
Нераспределенная прибыль	134
Целевое финансирование	-
Расчеты	
Кредиты и займы	11626
Кредиторская задолженность	6698
Баланс	32564
Чистые активы	14240

Отчет о прибылях и убытках

Наименование показателя	В миллионах белорусских рублей
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	9517
Налоги, включаемые в реализацию продукции	1130
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	6962
Расходы на реализацию	587
Прибыль (убыток) от реализации	838
Прочие операционные доходы	50
Прочие операционные расходы	48
Внереализационные доходы	207
Внереализационные расходы	212
Прибыль отчетного периода	835
Налог на прибыль и иные обязательные платежи	355
Прибыль к распределению	480

Руководитель: **Булдык Сергей Александрович**

Гл. бухгалтер: **Гидлевская Тамара Ростиславовна**

УНП 100219829

НЕ ЗДАЛІ СВОЕЧАСОВА

Калі праводзілася аперацыя па добраахвотнай здачы зброі («Арсенал»), то палявод з в. Ратайчыцы (Камянецкі раён) не здаў 22 патроны калібру 5,6 мм, і цяпер на яго завялі крымінальную справу. У аналагічнай сітуацыі апынуўся і беспрацоўны з Пінска, у якога канфіскавалі 20 патронаў калібру 7,62 мм.

Эксперты ўстанавілі, што патроны з'яўляюцца боепрыпасамі.

ЮВЕЛІРНАЯ КРАМА... НА ПРАЦЫ

Супрацоўнікі міліцыі ў Кобрыне затрымалі пакаёўку гасцініцы «Беларусь», якая прадала выхавацелю дзіцячага сада залаты ланцужок без пробы. Калі агледзелі рабочае месца пакаёўкі, то знайшлі там 51 залаты ланцужок і 12 г залатога лому. Канфіскаванае золата пацягнула на 32 млн 760 тыс. рублёў.

ДЛЯ РОДНАЙ ДАЧУШКІ...

Жыхарка в. Ляхоўцы (Маларыцкі раён), працуючы брыгадзірам участка мясцовага СВК, уносіла ў табель уліку рабочага часу фальшывыя звесткі аб выкананні працы сваёй дачкой у якасці жывёлавода. А калі маладзіца пайшла ў водпуск па цяжарнасці, то ёй налічылі 2 412 800 рублёў, хоць жанчына не працавала. У выніку — крымінальная справа і падпіска аб нявыездзе.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

МАГІЛЁЎ ЗНАЁМІЦЦА З ВЕНЕСУЭЛАЙ

У Магілёве праходзяць Дні культуры Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла. Культурную праграму ў магілёўскай ратушы адкрыла выстава партрэтаў выдатных дзеячаў вызваленчага руху Венесуэлы. У Магілёве пакажуць венесуэльскае кіно, прачытаюць лекцыі студэнтам універсітэта, запросяць на канцэрт калектываў Лацінаамерыканскага культурнага цэнтра імя Сімона Балівара. Мяркуецца, што сустрэча дэлегацыі Венесуэлы з кіраўніцтвам Магілёва паспрыяе далейшаму развіццю адносінаў паміж Баліварыянскай Рэспублікай і Магілёўскай вобласцю.

Ілона ІВАНОВА.

КАРЫНА ЯРУШ ПЕРАМАГЛА НА МІЖНАРОДНЫМ ФЕСТЫВАЛІ ЭСТРАДНАЙ ПЕСНІ

Салістка студыі «Септыма» Гродзенскага гарадскога Дома культуры Карына Яруш атрымала перамогу на XIV міжнародным фестывалі эстраднай песні ў Беластоку.

Гэта ўжо не першы поспех гродзенскай школьніцы. Летась яна стала ўладальніцай галоўнага прыза «Хрустальны мікрафон» 31-га міжнароднага дзіцячага фестывалю песні і танца «Конін-2010» у Польшчы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ОАО «Белгалантерея» сообщает, что выплата дивидендов за 2010 г. на акции акционеров будет производиться с 5 по 7 апреля 2011 года в кассе ОАО «Белгалантерея» по адресу: г. Минск, ул. Ботаническая, 5а.

УНП 100230667

Открытое акционерное олщество «Минсктелекомстрой» извещает своих акционеров о том, что общим собранием акционеров (протокол № 14 от 26 марта 2011 года) утверждены дивиденды за 4 квартал 2010 года в размере 615 рублей на одну акцию, которые будут выплачены в период с 25.04 по 23.06.2011 года в установленном порядке.

УНП 100068131

НЕ МАЮЧЫ ІНШАГА

Простая мова

Амаль па класіку:
Бывай, марозны, звонкі вечар,
Бывай, пушысты, мяккі снег...

У метро, пад зямлёй, вясна, відаць, не адчувалася б, але...

Кабета насупраць — высокая, мажная — сядзіць, гартае старонкі часопіса — шукае, што б пачытаць. І - такі знаходзіць. Але перш — падымае галаву, абводзіць усіх шчаслівым, нераможным позіркам...

І — скажу вам — ёсць ад чаго: у часопісе, на чарговым развароце, вялікімі літарамі напісана: «Быть худой уже не модно!»...

Ур-р-а!

...Тэлевізар глядзець таксама не модна, ну хіба між іншым: гатуючы, прасуючы... Ды і то — штось выбраўшы: як тая кабета ў метро, я шукаю — з дапамогай пульта «гартаю» каналы.

На чарговым — нейкае кіно. У кадры — двое, на лаўцы. Яна — з марозівам. Ён вучыць яе жыццю. Кажа, прынамсі, што не варта быць такой закрытай, заціснутай, — трэба разняволіцца. «Як гэта?» — пытае жанчына і быццам рэпеціруе: усміхаецца, размахвае рукамі — марозівам... пэцкае адзенне. «Што цяпер рабіць?» — зноў пытае ў «настаўніка». Той — ведае: кажа, што плямы трэба «апрацаваць» газай. «А потым?». «Потым — распрануцца, кінуць запалку ў гэты касцюм і купіць сабе нешта прыстойнае».

...Як вам парада?

Мне падабаецца!

Хоць бы за тое, што дазваляе «купіць» светлую ўсмешку, якая ва ўсе поры года ўпрыгожвае чалавека не менш, чым новая вопратка.

ДАЛЬНІ ПРЫЦЭЛ

Боты ўвосень шукала — ну, каб цёплыя і прыгожыя, каб на высокім абцасе і пры гэтым зручныя, каб па назе якраз і па боскай цане...

Знайшла: як казаў незабыўны Папандопала «мой гардэробчык» — селі, як улітыя! А ўжо як насіліся (у шырокім сэнсе гэтага слова)... Сабе і іншым казала, што калі за сезон парвуцца, — наракаць не буду: язык не павернецца...

Боты ці не «пачулі»: спачатку паляцеў замок у адным, потым дзірка з'явілася ў другім.

А следам — і сумная выснова: да наступнай зімы (на лечаным кані далёка ж не заедзеш?) зноў спатрэбяцца боты. Ну, каб цёплыя і прыгожыя, каб на высокім абцасе...

Знайсці іх, ведаю, цяжка, а таму — не выключана — пайду... у тую ж самую краму. І, калі будуць, куплю той самай мадэлі, той самай фірмы.

...На што — магчыма — яна і разлічвала?

ХТО ПРАЦУЕ — ТОЙ СВЯТКУЕ

Дзе боль — там рука, дзе гук (а тым больш нечаканы) — там вочы:

— Эй, асцярожней!..—чуецца з пярэдняй пляцоўкі аўтобуса, — а то паваліце зараз бабулю.

Шаноўнага веку, з палачкай, яна «выныркае» з натоўпу, запытальным «Будзеш выходзіць?» «расчышчае» сабе дарогу — аж пакуль, ля самых дзвярэй, не чуе хлапечае «Буду».

— А мне дапаможаш? — пытае бабуля.

Што гаворыць юнак, не чуваць — мусіць, нават ёй, бо следам гучыць па-настаўніцку строгае:

— Ты мне па-людску, выразна скажы: дапаможаш, ці не? — патрабуе кабета. — Калі не, — я іншых папрашу.

— Да сказал же — помогу! — адзываецца хлопец.

І сапраўды — выходзіць першым, спыняецца, працягвае жанчыне руку. Цярпліва чакае, пакуль яна абмацвае кульбай, потым нагой ніжнюю прыступку, цяжка апускаецца — на яе, а затым (і гэтак жа нясмела) на зямлю. І ўжо тут, нарэшце, кажа хлопцу сваё «Дзякуй».

— Ды няма за што, — раптам усміхаецца ён...

Можа, успомніўшы свае ўрокі беларускай і сваю настаўніцу?

Адкуль...

Хочаш мець беларускамоўны асяродак — стварыць!

Ці хоць паспрабуй!

СПЕЛА Б РЫБКА ПЕСЕНЬКУ...

Вечар, тэлевізар, прагноз надвор'я. У нас — зноўку холад (і такі ж абрыдлы!..), а вось на Кіпры, у Вене, ды што там — нават у Берліне...

— Каб вы толькі ведалі, як жа не хацелася адтуль з'язджаць! — зноў заводзіць суседка.

І зноў успамінае, распавядае, які там дом у іхняй сваячкі, якое харство навокал, якія парадкі, якія крамы, кошты, распродажы... «Каб маладзейшай была, далібог засталася б!» — усклікае яна. Не першы раз...

У першы, здаецца, адзываецца мужык яе:

— Гэта ты?.. Засталася б?! Ды не смяшы людзей! Ты ж ложак у спальні перастаўляла — тры ночы спаць не магла! А тут краіну змяніць... Ведама, баба — абы трындзець!

СТРЭМКА

...Здравствуйте! — заўсміхалася насустрач дзяўчына. — Вы на маникюр? Пожалуйста-пожалуйста! Проходите!

Дзверы ў яе кабінецік ўжо расчыніліся — значыць, адступаць позна, але і заходзіць... Бянтэжыў, мякка кажучы, знешні выгляд майстрыхі. Яна як быццам спусцілася з подыума ці сышла з нейкай замежнай вокладкі, каб паказаць нам, тутэйшым, як можна выфарбаваць і выстрыгчы валасы, як падкрэсліць усе рысы твару, як выпесціць ручкі і паразмалёўваць тыя ж пазногці...

— Прабачце, — сказала дзяўчыне, паказваючы свае (тры зламаныя...) і падумала, што гэта ўжо ўсё: болей, ні слоўца... Аж да самага «дзякуй» — на развітанне.

Ды не атрымалася, бо падчас «працэдуры» яна згледзела ля пазногця цёмную плямку, спытала:

— Что это?

І сама ж адказала:

— Стрэмка.

Выходзіць з ёю — тупейшай ці вастрэйшай, загнаной глыбей ці мяльчэй, пад скуру ці ў самае сэрца (а таму непазбежна балюча!) — жывуць у краі ўсё-такі многія.

НА ХОЛАДЗЕ

...Пальчаткі «згубіла», дакладна помніла дзе (на падваконні, у саліднай установе), дакладна помніла калі (напрыканцы рабочага дня). Назаўтра, да пачатку яго, спланавала зайсці. І знайсці.

Як аказалася, марна: нехта гэта зрабіў раней.

...Уявіла, як, напэўна, узрадаваўся, як агледзеў, як знайшоў ім «новыя пальцы» і як цяпер ім добра і цёпла. Што сагрэла трохі — душу.

Не сагрэўшы рукі.

«НЕ ХВАЛЮЙСЯ!..»

Ранак, рынак — чарга... У жанчыны, што стаіць за тройку чалавек наперадзе, звініць далькажык. Мелодыя досыць вясёлая, а вось навіны, відаць, не вельмі, бо...

— Что-то случилось, доча? — устрывожана пытае кабета.

Што чуе ў адказ, здагадацца не цяжка:

— Грубая ошибка? — удакладняе маці. — По твоей вине?.. Доченька, детка моя, не плачь! Что — накажут тебя?.. Объявят выговор?.. И премию снимут?.. На все сто процентов?!. От же собаки!.. У всех ведь бывают ошибки. Ты же ещё только учишься... Но ничего — пусть они ей подавятся, этой премией! А мы — как-то проживём. Я тебе помогу. У меня еще закатки остались, картошка есть...

Што яшчэ (у сэнсе — ёсць...), ужо не чуваць было, бо жанчына, не спыняючы размовы, дала зразумець, што ў чарзе па рыбу стаяць не будзе — сышла...

І, здаецца, усім, хто побач стаяў, пакінула — яснае разуменне: якое ж гэта шчасце ад блізкага чалавека ў цяжкую хвіліну пачуць такое простае і такое важкае: «Я памагу! Не хвалюйся! Неяк перажывём!»

НЕ МАЮЧЫ ІНШАГА?

...Успомніла бабка, як дзеўкай была — літаральна: Міхайлаўна (а ўжо ж прыгожа, няспешна) распавядае, як некалі яна з сяброўкамі — ад зямлі не адраслі, а ўжо навыпарадкі стараліся нечаму вучыцца, нешта рабіць: падмятаць, прыбіраць, паліваць ды палоць, шыць, вязаць, вышываць, гатаваць...

А ўсё дзеля чаго? Дзеля таго, каб людзям паказаць, што нешта ўмеюць, што нешта могуць, што яны — ужо не маленькія, што **«пры дзеле»**...

Цяпер і гэтак жа (не адросшы ад зямлі, навыпарадкі) дзяўчаткі, паказваюць, што **пры целе**.

Не маючы іншага?

ЦАЦА

Косцік жэніцца. Нявеста — ну вельмі прыгожая! Боцікі ў яе чорныя на высозных абцасах, шорцікі і куртачка — чырвоныя, скураныя, валасы — белыя, вочы — блакітныя, а ўжо пазногці... Нарошчаныя, доўгія-доўгія і з малюнкамі...

Распавядае пра гэта (ды ў падрабязнасцях) будучая залвіца — дзесяцігадовая сястра жаніха.

А ў бабулі яго ўражанні іншыя: «Бедны наш Косцічак, — распавядае яна, — гэткую цацу выбраў сабе! Дзве гадзіны часалася ды твар размалёўвала, пакуль снедаць прыйшла... Посуд за сабой — нават у ракавіну не паставіла (не тое каб памыць... Ці хоць прапанаваць)... Дзякуй не сказала... Яна што, вось гэткая, будзе сям'ю трымаць, мыць ды есці варыць? Яна дзіця захоча?.. Яна з гэтымі кіпцюрамі с... яму падатрэ?»

Два ўзросты — два погляды.

ЧАЛАВЕК. СЯРОД ЛЮДЗЕЙ

Да прыпынку «Станцыя метро «Партызанская» тралейбус ідзе амаль пустым: вечарам займай любое месца пад лямпачкай і чытай. Але там ужо...

Людзей — процьма (завод, універмаг, скрыжаванне...): маладых і старых, з дзецьмі і без... З чым, вядома ж, трэба лічыцца. Таму загадзя, яшчэ на пад'ездзе, складваю газету, пальчаткі, парасон, каб потым, калі спатрэбіцца, хуценька ўстаць, саступіць сваё месца. Ды...

— Не трэба! — грозна спыняе схварэлы дзядок з палачкай. — Хай маладыя падымуцца!

Ён заяўляе пра гэта гучна, з выклікам, трымаючы ў руках пасведчанне інваліда.

— Яны цяжарныя (адна і напраўду, — **Аўт.**), — шэптам кажу старому, баронячы маладзіц, якія толькі што селі.

— Што — усе?! — жахаецца дзед, сядаючы.

— Усе.

— І хлопец таксама?!

— Таксама.

Усе задаволеныя, усе смяюцца (найбольш — стары, бо гэта ж ён пажартаваў): сядзіць, усміхаецца... І крыху, відаць, шкадуе хлапца, які, уткнуўшы ў вушы навушнікі, слухае нешта сваё.

І не слухае наша.

НЕ ДА ПАЦЕРАЎ...

Знаёмая пад уражаннем: першы раз у гэтым стагоддзі ў рэстаран схадзіла. Расказвае, якія там наедкі былі, якія напіткі, госці, строі, гульні, танцы...

Што найболей уразіла?

У зале, апроч іх, яшчэ тры кампаніі былі — розныя па велічыні, але чыста жаночыя... І добра ж «нагудзеліся», калі ў рэстаран двух немцаў прынесла — не сказаць, каб прыгожых, не сказаць, каб маладых (хутчэй наадварот), але ж цвярозых... Дык ім нават з'есці не далі: не белы быў танец, — дзве жанчыны пацягнулі ў круг, чатыры — потым разбілі... Смешна глядзець.

Гэта — яна мне. Я ёй...

Як на сённяшні розум, — тое вяселле было камерным, бо спраўлялася яно ў шыкоўнай гарадской кватэры і гасцей там садзілі па «камерах»: гэта значыць, самых ганаровых, самых дарагіх сабралі ў адным вялізным пакоі (тады я нават не ведала, што такія ў гарадах бываюць), моладзь — у трохі меншым другім, усіх астатніх — суседзяў, супрацоўнікаў і г.д. — у найменшым трэцім. У чацвёртым — хораша граў аркестрык...

Маладым — гэта само сабой — было месца паўсюль: прыходзілі, хвілін з дзесяць сядзелі (прымалі віншаванні, «саладзілі» напоі) ды збягалі, каб праз паўгадзінкі з'явіцца зноў...

Зрэшты, пасля чарговага перапынку перамяшчацца сталі не толькі яны: некага з маладзейшых пацягнула ў пакой да пажылых, бо там спяваліся песні, некага з пажылых — да моладзі: прынамсі, вокам не паспела міргнуць, — да мужа падсела маладзіца, завяла нейкую размову. Хацела спачатку і я прыслініцца — «тры грошы» дзе ўставіць, — аказалася, не: яна гаварыла толькі да яго.

Што рабіць было мне? Парай слоў пракінулася з суседкай злева, падтрымала чыюсь прапанову выпіць, прыкусіла...

І пры гэтым краёчкам вока бачыла, што чарнявая па-ранейшаму штось даводзіць мужу, што ён ветліва слухае — не ў турме ж гадаваны...

Цяжка сказаць, колькі б гэта цягнулася, калі б не хлопец, што сядзеў насупраць і назіраў «карціну» наўпрост — у поўным аб'ёме. Назіраў спачатку з усмешкай, потым — з ціхім раз-пораз «Ну ни фига себе!.. Во дает!..», якое дзеўка не магла не заўважыць. І не пачуць.

Што зрабіла, пачуўшы? Устала, з сумам паглядзела на хлапца, спакойна сказала яму:

— Знаете, молодой человек, в ваши двадцать это может и смешно, в мои тридцать — нисколько.

Валянціна ДОЎНАР.

ПРАЦЯГЛАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗАМЕНЫ СУСТАВА

Прамая лінія

(Працяг. Пачатак у нумарах за 30 і 31 сакавіка.)

На пытанні чытачоў адказаў загадчык кафедры траўматалогіі і артапедыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук Алег КЕЗЛЯ.

☎— Карэлічы, Віктар Рыгоравіч, 72 гады. Вельмі баляць каленны і тазасцегнавы суставы. Што гэта можа быць?

— У такім узросце ў суставах адбываецца, як кажуць у народзе, адкладанне соляў. Сустаў быццам засмечваецца. Вам неабходна звярнуцца да хірурга ці траўматолага, каб урач вас паглядзеў і, магчыма, прызначыў тэрапеўтычнае лячэнне з дапамогай таблетак, мазяў і г.д.

— Мазі мне не дапамагаюць.

— У такім выпадку можа дапамагчы аперацыя па замене сустава. На жаль, такіх хворых цяпер вельмі шмат.

— А дзе робяць такія аперацыі?

— У Гродзенскай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

☎— Гомель, Марыя Пятроўна. Маёй сястры 78 гадоў. Нядаўна яна зламала шыйку сцягна. Пакуль лечыцца ў бальніцы. Скажыце, ці абавязкова ёй у будучым трэба пратэзаваць?

— Ёй абавязкова трэба аперыравацца. Аб'ём аператыўнага ўмяшання павінен вырашыць урач.

☎— Маладзечна, Надзея Аляксандраўна. Чула, што для лячэння траўмаў тазасцегнавога і каленнага суставаў прымяняецца такі метад лячэння, як артраскапія. У чым яго сутнасць?

— Пры гэтым метадзе мы з дапамогай інструмента «заходзім» у сустаў і бачым яго знутры. Пры выяўленні іншародных целаў, разрастанняў мы іх выдаляем, робім своеасаблівы «туалет» сустава, вычышчаем яго. І гэта дае пэўны лячэбны эфект.

☎— Гродна, Ганна Пятроўна, 51 год. У мяне дэфармуючы артроз правага тазасцегнавога сустава, 2-я ступень. Якія сучасныя метады лячэння можна прымяняць пры такім захворванні?

— Сучасныя метады лячэння ўключаюць фізіятэрапеўтычнае, медыкаментознае і аднаўленчае лячэнне. Пры другой ступені мы прапануем і хірургічнае лячэнне. Але для апошняга трэба бачыць ступень зношанасці сустава. Ёсць пэўныя групы аператыўных умяшанняў, якія захоўваюць сустаў, але мяняюць біямеханіку, г.зн. дазваляюць па-варочвацца суставу па-рознаму. І ў гэтым выпадку наступае палёгка.

☎— Навагрудак, Андрэй Мікалаевіч. Як вы ацэньваеце якасць пратэзаў, якія вырабляюцца ў Беларусі?

— Якасць пратэзаў, якія вырабляюць у Беларусі, цудоўная. Беларускі пратэз мае еўрапейскі сертыфікат якасці. Ён можа прадавацца ў любой еўрапейскай краіне без дадатковага дазволу на продаж. Гэта вышэйшая адзнака якасці сустаўнога пратэза.

☎— Мазыр, Ганна, 55 гадоў. Пры хадзе адчуваю трэск у тазасцегнавым суставе. Акрамя таго, сустаў пабольвае. Аб чым гэта можа сведчыць?

— Трэск у суставе можа быць зусім не тым, за што вы яго прымаеце. Гэта могуць быць праблемы з боку мышачнага апарату, яны вызначаюцца пры індывідуальным аглядзе. Акрамя таго, пры самых вялікіх сустаўных змяненнях — 3—4 ступені — сустаў не будзе хрусцець, ён проста будзе балець.

☎— Лагойск, Сяргей Пятровіч. Пры якіх паказаннях праводзіцца замена хворага сустава?

— Замена сустава праводзіцца пры пераломах шыйкі, рэўматоідным артрыце, ідэапатычным коксартрозе, асептычным некрозе галоўкі сцягна і пры траўматычных паражэннях тазасцегнавога сустава.

☎— Маладзечанскі раён, Ніна Васільеўна. Мяне чакае аперацыя з прычыны коксартрозу тазасцегнавога сустава. Яшчэ маю спандылёз, скаліёз. Ці дапаможа мне аперацыя?

— Аперацыя дапаможа, вам стане лягчэй, тазасцегнавы сустаў балець не будзе. Акрамя таго, выраўняецца даўжыня ног, і для спіны гэта будзе лепш. Але разлічваць на тое, што вы будзеце адчуваць сябе як у 17 гадоў, не варта.

— А па вуліцы я змагу хадзіць?

— Так, на гэта разлічваць можна.

— Я чакаю аперацыю ў Бараўлянах ужо год і сем месяцаў. Калі ж, нарэшце, надыдзе мая чарга?

— У канцы гэтага года вам яе зробяць.

— І яшчэ чула, што імпартныя сустаўныя пратэзы, хоць і каштуюць дорага, але лепшыя за беларускія. Ці так гэта?

— Гэта няпраўда. Беларускі сустаў зроблены з імпартных матэрыялаў, на імпартных станках. У яго беларуская ідэя, ён мае еўрапейскі знак якасці і поўнасцю адпавядае імпартным суставам. Таму не перажывайце за яго якасць. Гэта добры прадукт, зроблены нашымі рукамі на нашай зямлі.

☎— Брэст, Рыгор Іванавіч, 56 гадоў. Два гады таму зламаў нагу ў галёнкаступнёвым суставе. І дагэтуль нага ные пры змене надвор'я. Ці можна з гэтым неяк змагацца?

— Безумоўна, змагацца можна. У вас хутчэй за ўсё ёсць праяўленні посттраўматычнага артрозу. Лячыць нагу трэба з дапамогай фізіятэрапеўтычных працэдур — парафінавых ваннаў, лазератэрапіі, сагравальных працэдур. На гэтым фоне трэба прымаць медыкаменты. Такое комплекснае лячэнне будзе даваць добры эфект.

☎— Жодзіна, Аляксей Пятровіч. Мне 68 гадоў, маю сустаўныя праблемы з каленямі. Іх «круціць» да дрэннага надвор'я, яны скрыпяць, калі прысядаю, баляць падчас хуткай хады. Як можна зменшыць гэтыя непрыемныя адчуванні?

— Верагодна, вы метэазалежны пацыент, і ў вас праяўляецца такая схільнасць з боку суставаў. Я парэкамендаваў бы вам звярнуцца па кансультацыю да тэрапеўта або рэўматолага, каб спецыяліст вызначыў, ці няма ў вас нейкага сістэмнага захворвання. Калі яно ёсць, то трэба яго пралячыць.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

У БЕЛАРУСЬ ПРЫЛЯЦЕЛІ КНІГАЎКІ, ШПАКІ І БУСЛЫ

З пачаткам актыўнай вясны ў нашу кліматычную зону пачалі вяртацца з зімоўкі пералётныя птушкі. Як адзначыў спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан Шайкін, гэтымі днямі ў Беларусь прыляцелі з іншых куткоў свету больш за 60 відаў птушак.

Амаль ва ўсе рэгіёны краіны вярнуліся дахаты кнігаўкі, шпакі, палявыя жаўрукі, шэрыя жураўлі і белыя буслы. З кожным днём колькасць гэтых відаў птушак павялічваецца.

Увогуле, за апошнія 150 гадоў у Беларусі было зафіксавана 320 відаў птушак, з якіх цяпер гняздуецца ў нас каля 220, а прыкладна 160 відаў наведваюць наш край кожную вясну.

Больш падрабязную і дакладную інфармацыю аб тым, куды прыляцелі першыя крылатыя вестуны вясны, магчыма адшукаць на беларускім сайце аматараў назіранняў за птушкамі (бёдуотчараў) www.birdwatch.by/vysna2011. На гэтым сайце наведвальнікі могуць пакінуць і сваю інфармацыю аб уласных назіраннях. Дзякуючы вашым паведамленням табліца веснавога прылёту птушак у Беларусь будзе больш поўнай і цікавай.

Сяргей ПАЛІНІН.

Знойдзены самы старажытны надпіс у Еўропе

У Грэцыі знайшлі самы старажытны надпіс у Еўропе, паведамляюць інфармагенцтвы.

Ледзь прыкметныя сімвалы нанесены на гліняную таблічку ў Пелапанэсе паміж 1450 і 1350 гадамі да нашай эры.

Надпіс адносіцца да старажытнага мікенскага перыяду гісторыі Грэцыі, аб якім расказваецца ў паэмах Гамера. Ад таго часу амаль не засталося пісьмовых сведчанняў, таму што раней для пісьма выкарыстоўвалі ў асноўным неабпаленую гліну — вельмі недаўгавечны матэрыял.

У СТУДЭНТА СКРАЛІ НОЎТБУК

У Віцебску студэнт вечарам паведаміў у міліцыю пра тое, што яго знаёмы пакінуў ягоную кватэру, прыхапіўшы з сабой дарагі ноўтбук коштам больш за 2,2 мільёна рублёў. 31-гадовага госця, раней судзімага за крадзеж, затрымалі. Скрадзенае канфіскавалі. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении повторного аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

Аукцион состоится 19 апреля 2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Севастопольская, 121, каб. 213 (студия)

Организатор аукциона – Филиал «Междугородная связь» РУП «Белтелеком»
Адрес: 220049, г. Минск, ул. Севастопольская, 121.

Заявления на участие в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются **с 11 апреля по 19 апреля 2011 г.** в рабочие дни с 9 до 16 часов по адресу: г. Минск, ул. Севастопольская, 121, каб. 407. Заключительная регистрация участников аукциона 19 апреля 2011 года с 10 до 11 часов.

№ лота	Наименование объекта, его местонахождение	Площадь, кв.м.	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.	Срок аренды	Характеристика объекта	Условия пользования	Коэффициент*
1	Отдельное помещение капитального строения (вспомогательное техническое здание) по ул. Качана, 15 в г. Лида Гродненской обл.	22,1	193 375	19 337	до 5 лет	Расположено на 1-м этаже двухэтажного технического здания. Имеется естественное освещение, электроосвещение, центральное отопление, водоснабжение, канализация.	Для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли	2,5
2	Отдельное помещение капитального строения (вспомогательное техническое здание) по ул. Качана, 15 в г. Лида Гродненской обл.	21,8	190 750	19 075	до 5 лет	Расположено на 1-ом этаже двухэтажного технического здания. Имеется естественное освещение, электроосвещение, центральное отопление, водоснабжение, канализация.	Для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли	2,5
3	Капитальное строение (гараж) по ул. Качана, 15 в г. Лида Гродненской обл.	95,8	838 250	83 825	до 5 лет	Помещение расположено в боксе гаража. Освещение искусственное, электроснабжение. Отопление, водоснабжение, канализация отсутствуют.	Для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли	2,5

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе не позднее срока, указанного в настоящем извещении, наряду с другими документами, предусмотренными законодательством Республики Беларусь, представляют:

копию платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет филиала «Междугородная связь» РУП «Белтелеком» № 3012365460012 в филиале 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720, УНП 100185356.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результат аукциона оформляется протоколом.

До подписания договора аренды победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней, не считая дня проведения аукциона, обязан перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет торгов, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также в соответствии со счетом-фактурой возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета торгов осуществляется победителем (лицом, приравненным к победителю) аукциона в белорусских рублях в установленном порядке. Условия оплаты – разовый платеж.

Договор аренды заключается арендодателем и победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 5 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 9 до 17 часов (по предварительному согласованию).

*коэффициент предусмотрен п.9.2. Положения о порядке определения арендной платы при сдаче в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 г. №518. При наличии двух или более участников аукциона коэффициент будет увеличен на 0,5.

Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения или получения дополнительной информации: (017) 269 20 94, 269 21 94, факс 269 20 03; 8 029 775 80 40 (МТС).

Извещение о проведении аукциона ранее было опубликовано в газете «Звязда» за 29 октября 2010 года № 212 (26820).

ПрофитБрокер страховой брокер

БАЛАНС на 1 января 2011 года ООО «ПрофитБрокер»

АКТИВ	На начало года	На конец отчетного периода	ПАССИВ	На начало года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			**III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ**		
Основные средства	-	2	Уставный фонд	-	2
ИТОГО по разделу I	**-**	**2**	**ИТОГО по разделу III**	**-**	**2**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			**IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**	**-**	**-**
Запасы и затраты	-	19	**V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**		
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	-	1	Краткосрочные кредиты и займы	-	18
Денежные средства	-	2	Кредиторская задолженность	-	4
ИТОГО по разделу II	**-**	**22**	**ИТОГО по разделу V**	**-**	**22**
БАЛАНС	**-**	**24**	**БАЛАНС**	**-**	**24**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января по 31 декабря 2010 года ООО «ПрофитБрокер»

Наименование показателей	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ		
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	-	-
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	-	-
Валовая прибыль (020-021-030)	-	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	**-**	**-**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Операционные доходы	-	-
Операционные расходы	-	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов	**-**	**-**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Внереализационные доходы	-	-
Внереализационные расходы	-	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов	**-**	**-**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	**-**	**-**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения	**-**	**-**
Налог на прибыль	**-**	**-**
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	**-**	**-**

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества с ограниченной ответственностью «ПрофитБрокер» за период с 01 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

Директору Общества с ограниченной ответственностью «ПрофитБрокер» Федорако Алесе Николаевне.

Аудируемое лицо: Общество с ограниченной ответственностью «ПрофитБрокер» (ООО «ПрофитБрокер»)

Республика Беларусь, 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, д. 46В, ком. № 3-А.

Деятельность ООО «ПрофитБрокер» зарегистрирована решением Министерства финансов Республики Беларусь от 21.10.2010 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 806000309.

УНП 806000309.

Аудиторская организация: Аудитор – индивидуальный предприниматель Ткач Светлана Ивановна, Республика Беларусь, 220022, г. Минск, ул. Чайлытко, д. 20, кв. 64.

Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя от 24 августа 2000 г. № 955 выдано Минским горисполкомом.

УНП 100990426.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности ООО «ПрофитБрокер», состоящей из:

бухгалтерского баланса на 31.12.2010 г.;

отчета о прибылях и убытках с 01.01.2010 г. по 31.12.2010 г.,

отчета об изменении капитала с 01.01.2010 г. по 31.12.2010 г.,

отчета о движении денежных средств с 01.01.2010 г. по 31.12.2010 г.,

приложения к бухгалтерскому балансу с 01.01.2010 г. по 31.12.2010 г.,

пояснительной записки.

Руководство ООО «ПрофитБрокер» несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной бухгалтерской (финансовой) отчетности и соответствии совершенных ООО «ПрофитБрокер» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 18 ноября 1994 года «Об аудиторской деятельности» (с изменениями и дополнениями), республиканских правил аудиторской деятельности, нормативными правовыми актами, регулирующими деятельность страховых брокеров в Республике Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ООО «ПрофитБрокер» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, прилагаемая к настоящему аудиторскому заключению бухгалтерская (финансовая) отчетность ООО «ПрофитБрокер», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «ПрофитБрокер» на 1 января 2011 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2010 год, при этом совершенные ООО «ПрофитБрокер» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

Аудитор – индивидуальный предприниматель Ткач С.И.

21 февраля 2011 года

Аудиторское заключение от лица Заказчика получил 21 февраля 2011 г.

Директор ООО «ПрофитБрокер» Федорако А.Н.

Аудитор – индивидуальный предприниматель Ткач С.И.

ПАНЯДЗЕЛАК, 4 КРАСАВІКА

ПЕРШЫ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00 (з сурдаперакладам), **13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.05** Навіны.
6.05, 7.10, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.05, 8.10, 18.50, 1.40 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 «Дзелавое жыццё».
8.30 У свеце матораў.
9.10, 19.50 Серыял «Маргоша».
10.05 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё».
11.00, 17.25 Серыял «Зацьменне».
12.10 Серыял «Вясковая камедыя».
14.15 Сінематэка.
15.15, 19.10 Навіны рэгіёна.
15.40 «OFF STAGE LIFE».
16.05 Nota Bene.
16.30 Серыял «Маршрут міласэрнасці».
18.25 «Акно ў Еўропу».
19.25 «КЕНО».
19.30 «Арэна».
21.00 «Панарама».
21.45 «Камандзіроўка. Журналісцкае расследаванне».
22.00 Серыял «Падмані мяне-2».
23.15 «Праверка чутак».
23.45 Драма «Феерверк».
1.45 Дзень спорту.

АНТ

6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 Серыял «Мая жонка мяне прываражыла».
11.00 Нашы навіны.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15 Навіны спорту.
11.10 «Саюз».
11.50 «Хатынь. Засакрэчаная трагедыя».
12.20 «Дэтэктывы».
13.10 «Кантрольная закупка».
13.45 «Модны прыгавор».
14.50 «Зразумець. Дараваць».
15.25 «Хачу ведаць».
16.15 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
17.05 Серыял «Слова жанчыне».
18.20 «Зваротны адлік».
18.55 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Адкрыты фармат».
22.10 «След».
23.20 «Адкрыты космас». 1-я і 2-я серыі.
1.20 Начныя навіны.

ЛАД

6.30, 23.15 Серыял «Універ».
7.00 ЛАДная раніца.
8.00, 21.25 Тэлебарометр.
8.05 Кінанавела «Сяржант».
8.35, 18.00 Серыял «Ты маё жыццё».
9.40 Камедыя «Пацэліць у дзясятку».
11.25 Пра мастацтва.
11.55 Школа рамонту.
12.55 Гадзіна суда.
13.55 Серыял «Сіла прыцяжэння».
14.50 М/с «Сямейка піратаў».
15.15 «Дзеці новага пакалення».
16.20 Пазакласная гадзіна.
16.35 Навіны надвор'я.
17.05, 1.20 Серыял «Анатомія Грэй-5».
19.05 Хакей. КХЛ. Фінал канферэнцыі «Захад». У перапынку: Калыханка.
21.30 Беларуская часінка.
22.40 Серыял «Інтэрны».
23.55 Авертайм.
0.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.35 «Вялікае снеданне».
10.05 «Пяць гісторый».
10.40 Серыял «Трымай мяне мацней».
11.40, 17.30 «Званая вячэра».
12.35 «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна»: «Цуда-людзі».
13.50 «Зорны рынг». Іна Афанасьева супраць Найка Барзова.
15.00 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
16.00 «КультУРА!».
16.50 «Рэпарцёрскія гісторыі».
17.10 «Наша справа».
18.30 Серыял «Агонь кахання».
20.00 «Сталічны падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.35 Маст. фільм «Пастка для кілера».
23.00 «Сталічны футбол».
23.30 Маст. фільм «Вяртанне ў Брайдсхед».

МІР

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05 «Мільён пытанняў пра прыроду».
5.20, 15.20 «Дом з гісторыяй».
6.05 «Цік-так».
6.20 «У гасцях у Вітамінкі».
7.05 «Саюзнікі».
7.35 Серыял «Агульны рынак».
8.05 «Жывая гісторыя».
9.05 «Разам».
10.05 Серыял «Спас пад бярозамі».
11.05, 3.30 Маст. фільм «Некалькі інтэрв'ю па асабістых пытаннях».
13.05 М/с «Рыцары магіі».
13.30 Серыял «Старшакласнікі».
14.05 Серыял «Міліцэйская акадэмія».
14.30 «Ахвота да змены месцаў».
16.05, 23.05 Серыял «Вылечванне каханнем».
18.20 «Акцэнты».
18.30, 3.00 «Агульны інтарэс».
19.00, 2.00 Серыял «Пяты анёл».
19.50, 1.05 Ток-шоу «Слова за слова».
20.45 «ХХ стагоддзе: найвялікшыя моманты гісторыі».
21.20 «Зямля і людзі».
22.05 Дак. фільм «Байканур: хроніка трагедыі».

8 КАНАЛ

7.00, 10.55, 16.55, 17.25, 18.30, 19.40, 21.10, 23.45 «Надвор'е».
7.05, 17.30 Серыял «Прыторшчык».
8.00, 18.35 Серыял «Урон».
9.00, 12.40 «Кінаблакнот».
9.30, 16.05 «Мультпарад».
10.00 «Сакрэтныя матэрыялы».
11.00 Маст. фільм «Падарожжа да цэнтра Зямлі».
13.00 Трылер «Метэарыт». 2-я серыя.
14.45 Дак. серыял «Падзеі і людзі».
15.45 Дзённік «Новай хвалі».
16.30 «Расказы пра жывёл».
17.00 «Тэлефабрыка».
19.45 Серыял «Сага пра Фарсайтаў».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-гульні — «Лайт».
21.15 Драма «На апошнім бярозе». 1-я серыя.
23.15 «Бульбокс».

ВТБ

6.00, 23.30 Інтэрактыўны блок «PLAY».
8.00, 18.00, 23.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 13.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00, 15.00, 19.00 Серыял «Кадзцтва».
11.00 Серыял «Цуды.com».
12.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
14.00 Серыял «Гром у раі».
16.00 Драма «Дастукацца да нябёсаў».
21.00 Драма «Суседзі па пакоі».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
9.00 «Карціна свету».
9.55 Надвор'е на тыдзень.
10.00 «Пакой смеху».
10.25 «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 18.45 Серыял «Ефрасіння».
12.20, 16.20 «Кулагін і партнёры».
12.50 Дак. фільм «Ракавая памылка генерала Пугі».
13.50, 16.50, 19.50, 23.35 Навіны—Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.25 «З новым домам!». Ток-шоу.
17.35 Серыял «Пяць хвілін да метро».
20.30 Серыял «Варажба пры свечках».
22.20 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
23.20 «Нічога асабістага».
23.45 «Весткі.ru».
0.05 «Дзяжурны па краіне». Міхаіл Жванецкі.

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 «НТБ раніцай».
8.35 «Праграма Максімум».
9.35, 15.40, 18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25 Сёння.
10.20 «Кулінарны паядынак».
11.20 «Чыстасардэчнае прызнанне».
12.05 «Да суда».
13.25 «Пракурорская праверка».
14.25 «Давайце мірыцца!».
15.15 «Справа густу».
16.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
19.35 Серыял «Ляснік».
23.50 «Сумленны панядзелак».
0.40 «Школа зласловуя».

ТНТ

5.00 «Невытлумачальна, але факт».
6.00, 11.10 «Нікеладэон на ТНТ».
7.30 «Жаночая ліга».
8.30, 17.00, 19.00 «Універ». Сітком.
9.30, 13.00, 18.30 Камедыя «Шчаслівыя разам».
10.40 «Маска». М/с.
13.30, 22.00 «Дом-2».
15.20 Баявік «Тэлепорт».
17.30, 19.30 «Рэальныя хлопцы». Камедыя.
18.00 «Інтэрны». Сітком.
20.00 Камедыя «Элвін і бурундукі».
23.30 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
0.00 Камедыя «Тут кураць».
1.50 «Камедзі Клаб».
3.55 «Школа рамонту».

ІНТЭР+

6.30, 7.10, 7.35, 8.10, 8.35 З новай раніцай.
7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
9.10, 5.50 Адзін у полі.
9.45 Дак. фільм «Асцярожна. НЛА».
10.35 Пазавочы.
11.15, 20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.15 Знак якасці.
12.45, 1.30 Ток-шоу «Здароveньки булы».
13.25, 23.55 Крымінальныя справы.
14.10 Дак. фільм «Два Міронавых».
15.00 Тэлефармат.
15.35 Украінская топ-дваццатка.
16.50, 1.05 Серыял «Свая каманда».
17.15, 0.40 Серыял «Простыя ісціны».
17.45, 2.15 Формула кахання.
18.30, 3.30 Серыял «Агонь кахання».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
21.15, 5.00 «Усе свае».
22.00 Маст. фільм «Прывалаўскія мільёны». 1-я серыя.
23.25 Агенты ўплыву.

КУЛЬТУРА

6.00 «Еўраньюс».
9.00, 14.30, 18.30, 22.30 Навіны культуры.
9.15 «Хто там...».
9.40, 0.35, 1.50 Праграма перадач.
9.50 «Дзяўчына спяшаецца на спатканне». Маст. фільм.
11.00 «Западведныя людзі». Дак. фільм.
11.40 «Лінія жыцця». Таццяна Васільева.
12.35 «Гісторыя твораў мастацтва». «Аголены Вальтэр».
13.05 А. Салакру. «Месье Ленуар, які...». Тэлеспектакль.
14.15, 16.35, 0.20 «Сусветныя скарбы культуры».
14.40 «Падарожжа неразлучных сяброў». М/с.
14.45 «Наргіс». «38 папугаяў». М/ф.
15.15 «Дзяўчынка з акіяна». Серыял.
15.40 «Малпы-зладзюжкі». Дак. серыял.
16.05 «Маналог у 4-х частках».
16.50 Л. Бетховен. Канцэрт № 3.
17.35 Прыступкі цывілізацыі. «Картографы».
18.45 Галоўная роля.
19.05 «Саці. Нясумная класіка...».
19.45 «Астравы». Іна Чурыкава.
20.25, 0.40 Academia.
21.15 «Тым часам».
22.00 «Хто мы?».
22.55 «Інавацыя. Вобраз сучаснага мастацтва». Дак. фільм.
23.40 Дакументальная камера.
1.30 Ф. Шуберт. Інтрадукцыя і варыяцыі.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Да і пасля...». Год 1973.
6.30 «Песня-73».
7.25 «Вера, Надзея, Любоў і нянавісць». 1973 год.
8.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00 «Вох, ужо гэтая Насця!». Маст. фільм.
10.15 «Ранішняя пошта».
11.00 «Акулы пяра».
12.00, 21.00 «Народжаныя ў СССР».
13.00 «Блакітны агеньчык». 1963 год.
14.00 Быў час.
15.00 «КВЗ-87».
17.00 «Добрай раніцы, Дар!». Дак. фільм.
17.30 «Пад знакам «Пі». 1990 год.
18.40 «Іркуцкая гісторыя». Маст. фільм. 1-я серыя.
22.05 «Ілья Рэзнік у тэатры і песні». 1991 год.
23.00 «Няма праблем». 1991 год.
0.00 «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк».
0.40 «Следства вядуць знаткі». Тэлефільм. 1981 год.
3.00 «Колба часу».
4.05 «Кінапанарама». 1980 год.

MTV

5.00, 3.20 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
7.25 Руская дзясятка.
8.20 «Усё лепшае ў табе». Серыял.
8.45, 2.05 Магія Крыса Энджэла.
9.10 Уся праўда пра мяне.
10.00, 18.00 «Ранеткі». Серыял.
10.55 Шопаголікі.
11.55 Хто круцейшы.
12.25, 23.15 News блок.
12.35, 23.25 Дзённікі «Volvo Fashion Week».
12.40, 14.50, 21.20, 22.50 Індустрыя моды.
13.05 News блок Weekly.
13.35, 22.25 «Два з паловай чалавекі». Серыял.
14.00, 23.35 «Чак». Серыял.
15.00, 20.30 «Подыум».
15.50, 17.30 Вольны.
16.00 Love машына.
16.30, 19.00 Каханне з першага позірку.
20.00 «Вялікія надзеі». Серыял.
21.30 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.
0.25 «Клініка».
0.50 Трэндзі.
1.15 Тайныя спакусы курортнага гатэля.
1.40 Шалёныя продкі.
1.30 Тэлепорт.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Меладрама «Чужая радня».
8.30, 14.35 Камедыя «Шафёр на адзін рэйс».
10.50, 16.55 Маст. фільм «Сентыментальнае падарожжа на бульбу».
14.05 Плюс кіно.
18.30, 0.30 Камедыя «Дзявочая вясна».
20.30, 2.30 Драма «Жывы труп».
22.45, 4. 45 Камедыя «Прахіндзіяда, або Бег на месцы».

ДОМ КІНО

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Шчаслівы».
3.45 Баявік «Уцёкі».
5.45 Драма «Чужая Белая і Рабы».
7.20 Трагікамедыя «Кадкіна кожны ведае».
8.40 Драма «Тактыка бегу на доўгую дыстанцыю».
9.45 Меладрама «Пачні спачатку».
11.45 Драма «Гонкі без фінішу».
13.10 Камедыя «Калі б я быў начальнікам...».
14.25 Драма «Бывай, шпана замаскварэцкая...».
16.05 Меладрама «Не баліць галава ў дзятла».
17.25 Камедыя «Гульня».
19.45 Драма «Чацвёртая група».
21.40 Кінаальманах «Зусім сур'ёзна».
22.45 Драма «Конік».
0.10 Камедыя «Далоў камерцыю на любоўным фронце».
1.25 Меладрама «Неба са мной».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Фільм-казка «На залатым ганку сядзелі...».
6.10, 10.10, 14.10 М/с «Матчрэванш». М/ф: «Певень і фарбы», «Салют» Алімпіяда!».
7.00, 11.00 Казкі рускіх пісьменнікаў. «Дванаццаць месяцаў».
7.55, 11.55 Рускія народныя казкі. «Царэўна-жаба». М/ф: «38 папугаяў», «Заяц Коська і крынічка».
15.00 Маст. фільм «Вох ужо гэтая Насця!».
16.15 М/с «Кракадзіл Гена». М/ф: «Чумацкі шлях», «Вясёлая карусель» № 27.
17.00 М/с «Чарапашка-герой». Казкі народаў свету. «Гунан-батор». Казкі замежных пісьменнікаў. «Чурыдзіла».
18.00 «Урокі цётачкі савы»: «Урокі добрых паводзінаў». М/ф: «Зялёны конік», «Паважаны Лясун», «Танцы лялек».
19.00, 1.00 Серыял «Аэрапорт».
20.00, 2.00 «Завяшчанне Леніна».
21.00, 3.00 Серыял «Целаахоўнік-2».
22.00 Серыял «Сяржант міліцыі».
23.30 Серыял «20 снежня». 1-я серыя.

ТБ3

5.00 М/ф.
5.30, 1.00 Серыял «Альф».
6.00, 1.30 Дзецям пра звераняў.
6.30, 14.00 Дак. фільм «Гарадскія легенды».
При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

2. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка.

3. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, выполнения условий, предусмотренных в протоколе аукциона и решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

4. Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz , www.gki.gov.by.

г. ВИТЕБСК **15.04.2011**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

начальная цена продажи недвижимого имущества снижена на 50 %

№ Лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Здание мастерской, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Боровая, д. 9, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 250/С-27778 (здание специализированное коммунального хозяйства – здание мастерской), одноэтажное кирпичное, 1985 г.постройки, фундамент бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша рулонная, общая площадь 98,5 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 243500000001001207, площадь 0,0923 га для содержания и обслуживания здания мастерской, срок аренды 25 лет. Использование – под специализированное здание здравоохранения и предоставления социальных услуг.	38 861 113	3 886 110

Организатор: фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail:votfondgi@tut.by.

Аукцион состоится «15» апреля 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 14.04.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 15.04.2011 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения горисполкомом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллиона рублей, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

Подробная информация о продавце, условиях продажи недвижимости, условиях участия в аукционе опубликована в газете «Звязда» № 28 (26892) от 12.02.2011.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении открытого аукциона по продаже права аренды земельных участков.

1	Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов	Аукцион состоится 13 мая 2011г. в 11.00 по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»		
2	Срок приема документов	с 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 06 мая 2011 года		
3	Номер лота	1	2	3
4	Адрес земельного участка	Жлобинский район, Пиревичский с/с, д.Салтановка, ул.Вокзальная (в районе ж/д вокзала)	Жлобинский район, г. Жлобин, пр-д Красный, 7	Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Малевичская, 30/1
5	Кадастровый номер участка	321884805101000119	321850100004002470	321850100003003589
6	Площадь, га	0,1091	0,0400	0,0050
7	Целевое назначение	для строительства объекта торговли	для строительства и обслуживания автосалона, объектов торговли, общепита, бытового обслуживания, административно-складского назначения	для установки и обслуживания остановочного комплекса
8	Срок аренды	10 (десять) лет	30 (тридцать) лет	10 (десять) лет
9	Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно - геологические условия	Участок свободен от застройки (инженерно - геологические условия будут определены на стадии производства проектно - изыскательских работ)		
10	Ограничения и условия	1. внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; 2. возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; 3. заключение победителем с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; 4. получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год; 5. осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;		
		6. 0,0299 га – охранная зона линии электропередачи с напряжением 10 кВ	6. 0,0167 га – охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ	6. установление остановочного навеса не менее площади торгового павильона
11	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Подключение к общегородским сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД.		
12	Начальная стоимость, рублей	77 143	7 199 380	365 993
13	Сумма задатка, рублей	5 000	100 000	30 000
14	Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей	1 518 058	702 062	1 754 747
15	Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей	1 000 000	1 000 000	1 000 000

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 № 462.

2. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В течение 10 рабочих дней местный исполнительный комитет принимает решение о предоставлении земельного участка в аренду. Победитель обязан внести плату за право аренды земельного участка, определенную в результате торгов, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

3. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление об участии в нем подано только одним гражданином, индивидуальным предпринимателем или юридическим лицом, местный исполнительный комитет при наличии согласия соответствующего из указанных лиц в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении этому лицу земельного участка в аренду. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо обязаны внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона. После совершения лицом названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет заключает с ним договор аренды земельного участка.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) не позднее 06 мая 2011 года подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354.

6. Оплата стоимости предмета аукциона, расчеты с организатором аукциона осуществляются в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости земельного участка.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. Контактные телефоны: 8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.

У **суд Лёзненскага раёна Віцебскай вобл.** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **МАКАРАВАЙ Наталлі Міхайлаўны**, 1972 года нараджэння, ураджэнкі г. Бялова Кемераўскай вобл., РФ, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Віцебск, вул. 7-я Полацкая, д. 3. Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Макараву Н.М., паведаміць іх суду Лёзненскага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Здарэнні

ТРЫ «ФАЛЬКСВАГЕНЫ», «КРАЙСЛЕР» І ... «МАЗ»

Пяць аўтамашын атрымалі пашкоджанні на вуліцы Кабяка ў Гродне з-за аднаго з іх — грузавіка, паведамляе абласная Дзяржаўтаінспекцыя.

Прыехаўшы на будоўлю, кіроўца «МАЗа» спыніўся перад варотамі, заглушыў рухавік, зацягнуў ручны тормаз і пайшоў глядзець, як лепш заехаць для загрузкі грунту. Аднак аўтамабіль пакаціўся ўніз, нарабіўшы бяды іншым транспартным сродкам. Першай «ахвярай» грузавіка стаў «фальксваген», ад якога пацярпела другая машына гэтай жа маркі, якую, у сваю чаргу, адкінула на «крайслер». А апошні ўдарыў яшчэ адзін «фальксваген».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

на 1 января 2011 г.

Организация	**Открытое акционерное общество «Катэк»**	по ОКЮЛП	808001233
Учетный номер плательщика	**808001233**	УНП	808001233
Вид деятельности	производство электротехнического оборудования	по ОКЭД	31201
Организационно-правовая форма	Открытое акционерное общество	по ОКОПФ	1131 220
Орган управления	Юридическое лицо без ведомственной подчиненности	по СООУ	99900
Единица измерения	млн. руб.	по ОКЕИ	408
Адрес	**220075, г. Минск, ул. Инженерная, 22-304**		

Актив	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	795	877
амортизация	102	173	268
остаточная стоимость	**110**	**622**	**609**
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	20	20
амортизация	112	8	13
остаточная стоимость	**120**	**12**	**7**
Вложения во внеоборотные активы	**140**	**248**	**16**
ИТОГО по разделу I	**190**	**882**	**632**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	**210**	**4 673**	**5 527**
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	2 556	2 430
расходы на реализацию	214	-	1
готовая продукция и товары для реализации	215	43	241
товары отгруженные	216	603	2 678
расходы будущих периодов	218	1 471	177
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	15	37
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	**240**	**978**	**1 377**
В том числе: покупателей и заказчиков	241	3	3
поставщиков и подрядчиков	242	230	913
по налогам и сборам	243	77	253
по расчетам с персоналом	244	-	1
разных дебиторов	245	668	207
Денежные средства	**260**	10	-
Финансовые вложения	**270**	1	938
ИТОГО по разделу II	**290**	**5 677**	**7 879**
БАЛАНС (190 + 290)	**300**	**6 559**	**8 511**

Пассив	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	**410**	152	152
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	**411**	**-2 761**	-2 761
Добавочный фонд	**430**	1 299	1 348
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	**450**	1 902	1 905
Доходы будущих периодов	**470**	-	22
ИТОГО по разделу III	**490**	**592**	**666**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	**610**	3 985	3 900
Кредиторская задолженность	**620**	**1 982**	**3 945**
В том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	468	2 730
перед покупателями и заказчиками	622	1 409	1 065
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	69	75
по налогам и сборам	625	8	11
по социальному страхованию и обеспечению	626	25	25
перед прочими кредиторами	628	3	39
ИТОГО по разделу V	**690**	**5 967**	**7 845**
БАЛАНС (490 + 590 + 690)	**700**	**6 559**	**8 511**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701	-	-
краткосрочная кредиторская задолженность	702	1 982	3 945

Активы и обязательства, учитываемые за балансом	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001	16	16
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002	-	109
Материалы, принятые в переработку	003	39	-
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007	-	163

ОТЧЕТ
о прибылях и убытках

с 01 января 2010 г. по 01 января 2011 г.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	**010**	16 180	9 239
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	709	1 094
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010 – 011)	**020**	**15 471**	**8 145**
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	**030**	13 305	8 353
Валовая прибыль (020 – 021 – 030)	**040**	**2 166**	**-208**
Управленческие расходы	050	760	-
Расходы на реализацию	060	-	323
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020 – 030 – 050 – 060)	**070**	**1 406**	**-531**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	12 575	3 677
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080 – 081)	**090**	**12 575**	**3 677**
В том числе: доходы от операций с активами	093	12 575	3 677
Операционные расходы	**100**	**12 560**	**3 674**
В том числе: расходы от операций с активами	102	12 560	-
прочие операционные расходы	109	-	3 674
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090 – 100)	**120**	**15**	**3**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	**130**	165	177
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130 – 131)	**140**	**165**	**177**
Внереализационные расходы	**150**	1 575	163
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140 – 150)	**160**	**-1 410**	**14**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (± 070 ± 120 ± 160)	**200**	**11**	**-514**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (± 200 + 210 – 220)	**240**	**13**	**-514**
Налог на прибыль	**250**	2	-
Прочие расходы и платежи из прибыли	**270**	6	3
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200 – 250 – 260 – 270)	**300**	**3**	**-517**

РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

Показатель		За отчетный период		За аналогичный период предыдущего года	
наименование	код	доход	расход	доход	расход
1	2	3	4	5	6
Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании	350	-	-	-	92
Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте	380	165	1 575	165	70
Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности	390	-	-	5	-
Прочие доходы и расходы	400	-	-	7	1
ИТОГО	500	165	1 575	177	163

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў КРАСАВІКУ

1, пятніца, 3.00—22.00
2, субота, 1.00—10.00
4, панядзелак, 9.00—22.30
6, серада, 1.00—23.30
7, чацвер, 1.00—10.30
9, субота, 1.30—20.00
11, панядзелак, 11.00—23.00
12, аўторак, 1.00—3.00
13, серада, 19.00—23.30
14, чацвер, 1.00—5.30
15, пятніца, 20.00—24.00
16, субота, 0.00—6.00
18, панядзелак, 1.30—5.30
20, серада, 4.00—6.00
21, чацвер, 16.00—23.00
22, пятніца, 0.00—9.30
24, нядзеля, 1.00—17.00
26, аўторак, 10.30—22.30
27, серада, 4.00—19.00
28, чацвер, 2.30—23.00
29, пятніца, 1.30—16.30

Сёння — Міжнародны дзень птушак

Птушыныя «палацы» — уласнымі рукамі

У сталічнай экалагічнай гімназіі № 19 вясновы сезон у самым разгары. Клумбы аднаўляць яшчэ ранавата — снег не сышоў, а вось рыхтавацца да прылёту птушак — самы час. Шпакі кожны год вясной вяртаюцца на сваю малую радзіму, каб засяляць шпакоўні і будаваць сям'ю. І кожны год вучні разам з настаўнікамі вывешваюць у сваім прыродным садзе новыя хаткі для іх. Сёлета ў гімназіі чакаюць каля пятнаццаці гаманкіх птушыных сем'яў. Пакуль дзяўчаты здымаюць кармушкі (дзеляцца, што гэтай зімой да іх у госці завітвалі нават снегіры), хлопцы нясуць з любоўю зробленыя шпакоўні.

На здымках: вучні 5 «А» класа гімназіі № 19 ужо не першы год удзельнічаюць у праекце «Разам з птушкамі».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

А ТЫ КАЖАШ, ВЯСНА. МО І ПРАЎДА, ВЯСНА?..

Нефармат

Сядзім з дачкой у чарзе ля аднаго з кабінетаў дыспансэра спартыўнай медыцыны, людзей — процьма. Адны ідуць без чаргі, бо ім выступаць на спаборніцтвах, другія — бо яны ўдзельнікі зборных камандаў, трэція — бо іх арганізавана прывёў трэнер. Астатнія, натуральна, сварацца. Вось адзін бацька малога спартсмена счапіўся ў вуснай перапалцы з трэнерам, якая спрабуе па-за чаргой правесці групу з дзесяці дзяцей. Ні пра што не дамовіўшыся, яны ідуць высвятляць адносіны да загадчыцы. Потым праходзіць хвілін дваццаць, а назад яны не вяртаюцца. «Мабыць, пазабіваліся», — жартуе мужчына, які з сынам заняў чаргу пасля нас. Мы з ім адзіныя, хто не лямантуе, а стаічна пераносіць цяжар доўгага чакання. А яшчэ дзеці, якія праходзяць камісію самастойна, без бацькоў.

Побач стаяць хлопчыкі гадоў дзевяці і вядуць цікавую гутарку. «Чаму ў цябе ў медычнай картцы прозвішча перакрэслена і напісана іншае?», — пытае меншы ў большага. «А ў мяне два таты, — адказвае таварыш па секцыі. — Спачатку быў адзін, потым мама з ім пасварылася. Цяпер — другі. Адзін быў Саша, другі Сяргей». «Ну і каторы лепшы? — не ўтрываў мой дарослы сусед па чарзе. «Па мне дык абодва нядрэнныя, але ж мама выбірае», — пафіласофску заключае спартсмен-пачатковец.

Тым часам нам тлумачаць прычыну такога наплыву людзей. Усе групы розных спартыўных школ павінны прыходзіць медкамісію ў адпаведнасці з графікам. Але некаторыя трэнеры і кіраўнікі школ «праспалі» свой час і не накіравалі дзяцей на медыцынскае абследаванне яшчэ зімой. А цяпер прыйшла вясна, пайшлі праверкі, і тых удзельнікаў секцый, якія не маюць медыцынскай даведкі, да трэніровак не дапускаюць. Вось і пайшлі валам: хто па графіку, хто без графіка, таму і ўтвараюцца натоўпы ледзь не пад кожным кабінетам. Што такое праходжанне камісіі па-за графікам, мы адчулі яшчэ на мінулым тыдні, калі на прыём да доктара трапілі праз чатыры гадзіны чакання. А з другога боку, зразумела, што ў такой сітуацыі, якая склалася, быццам бы ніхто не вінаваты. Незразумела толькі, чаму правяральшчыкі сталі зазіраць у спартыўныя школы толькі з надыходам вясны. Хіба раней яны холаду баяліся?

Праўда, пакуль што вясна цяплом яшчэ нікога не наталіла. Яна наогул сёлета прыйшла з халадком клопатаў і праблем. Акурат з яе надыходам палезлі ўгару цэны. І гэтаму працэсу пакуль што не відно канца. Вясна яшчэ адзначылася войнамі ў Афрыцы, фінал якіх не можа прадказаць ніводзін, нават самы геніяльны, аналітык, і страшнейшым землятрусам у Японіі, колькасць ахвяраў якога нават пакуль нельга падлічыць дакладна.

Прыродная катастрофа, якая пацягнула за сабой яшчэ і тэхнагенную, атрымала нечаканы водгук у інтэрнэце. Мэтр расійскага кіно Мікіта Міхалкоў неасцярожна выказаўся наконт рэлігійна-філасофскай праблемы граху і кары за яго. Неасцярожна, бо, захапіўшыся разважаннямі, прывёў за прыклад і японцаў, якія церпяць. І нават калі не хацеў пакрыўдзіць людзей з далёкай краіны, то зачапіў за самае жывое і балючае. А цяпер мусіць апраўдвацца. І, вядома, у адказ пачаўся вэрхал. Усе нядобразычліўцы паспяшаліся звесці рахункі з рэжысёрам і павесіць на яго нават тых сабак, якіх ён і ў вочы не бачыў. Зараз жа сам д'ябал не разбярэцца — хоць Мікіта Сяргеевіч сябе і назваў у сваім твітары «Бесагонам» з прэтэнзіяй на разгон д'яблаў — хто ў той дыскусіі праваднік, а хто «бес» . І ўсё ж, на мой погляд, не трэба было чапаць Японію, якая яшчэ не пахавала свае ахвяры. Бо таму, хто страціў блізкіх, застаўся без даху над галавой, пазбавіўся ўсяго нажытага, не суддзя той, хто з разумным выглядам разважае перад камерай, жэстыкулюючы рукамі ў пярсцёнках, і ведаючы, што ля парога яго чакае машына з мігалкай. Зусім не суддзя.

Гэтай вясной наогул вельмі шмат мітусні, баязлівых клопатаў, апасенняў. Адны тэрмінова купляюць машыны, бо летам іншамаркі, як вядома, падаражэюць. У Брэсце з гэтай нагоды перапоўнены ўсе гасцініцы. Ахвотныя купіць машыны едуць бліжэй да мяжы з Расіі, іншых краін. Нашы суайчыннікі таксама пазычаюць грошы, бяруць крэдыты, высільваюцца, як могуць, каб набыць новы транспартны сродак. І цяпер нават на рэгістрацыю ўжо новых машын чэргі займаюць ледзь не з пяці раніцы. У адзін з выхадных дзён мой сваяк стаяў у такой чарзе: раптам рэгістраваць перасталі, бо завіслі камп'ютары. Аказалася, мышы перагрызлі провад. Суперсучасная тэхніка бывае зусім безабароннай перад звычайнымі грызунамі... Ва ўсёй чаргі ледзь не здарыўся нервовы зрыў.

А яшчэ людзі мітусяцца ў банках. Адны купляюць валюту, іншыя спрабуюць высветліць у супрацоўнікаў, што будзе далей, ці варта пакідаць валютныя ўклады, ці лепей іх забраць. Тыя, як могуць, супакойваюць.

Нервуюцца і кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў, іх падначаленыя: толькі распачнуць сеяць, а тут зноў мароз, зноў холад.

І ўсё ж вясна паступова прыходзіць. На поўдні краіны з'яўляюцца першыя краскі. Хочацца думаць, што цяпло і адвечная прыгажосць вясны нагрэюць зямлю і душы. Павінна ж пацяплець.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.44	19.45	13.01
Віцебск —	6.32	19.36	13.04
Магілёў —	6.34	19.35	13.01
Гомель —	6.32	19.30	12.58
Гродна —	6.59	19.59	13.00
Брэст —	7.01	19.58	12.57

Месяц
Маладзік 3 красавіка.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны
Пр. *Сафіі, Івана, Інакенція.*
К. *Гражыны, Ірыны.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



Цікава ведаць

ЯК ПІЛІП МАКІТРА СТАЎ ПОЛАМ МАКАРТНІ

Прысутныя ў Кіеве на канцэрце сэра Пола былі прыемна здзіўлены, калі знакаміты ліверпулец звярнуўся да іх па-ўкраінску. Нягай некалькімі словамі. Уяўляеце іхняе здзіўленне: кумір меламанаў усяго свету чэша на чарнігаўскім дыялекце! А здзіўляцца няма чаму: Піліп адсюль родам, а дакладней — з сяла Чайкіна. Так-так, з таго самага. Думаю, неабавязкова валодаць фантазіяй Герберта Уэлса, каб здагадацца, хто быў першым настаўнікам ігры на гітары ў малога Піліпка. Вядома — сусед. Кучмы жылі праз дзве хаты ад Макітраў.

Першым пытаннем, якое мы задалі нашаму госцю, было: «Сэр Пол, як да вас правільна звяртацца? Бо розныя выданні Ваша прозвішча пішуць у самай рознай транскрыпцыі: «Макартні», «Макарці», «МакКартні. Як правільна?» На гэта ён адказаў так: «Шаноўныя мае сябры-землякі, маё сапраўднае прозвішча — Макітра. Мы з часоў дзядоў-прадзедаў усе — Макітры. Род наш — старадаўні казацкі. Відаць, камусьці з продкаў далёкіх слаўных рыцараў-запарожцаў далі такое прозвішча. Ці то за вялікую, як макітра, галаву, ці то за вялікую любоў да варэнікаў са смятанаю ў макітры. Таму называйце мяне Піліпам Іванавічам або панам Піліпам». І далей пан Піліп распавёў сваю мудрагелістую, як магло б падацца на першы погляд, гісторыю.

Нарадзіўся Піліпка перад самай вайной у сям'і настаўнікаў. Бацька Іван Піліпавіч выкладаў нямецкую мову і фізкультуру, мама Тэкля Сямёнаўна — украінскую мову, спевы і музыку. У гонар дзядулі хлопчыка назвалі Піліпком. Пасля вызвалення Чарнігаўшчыны бабуля запісала, што нарадзіўся ён у ліпені 1942 года, гэтая дата нараджэння і дагэтуль упісана ў дакументах сэра Пола, але ў школу ён пайшоў у свае сапраўдныя сем гадоў. Вучыўся Піліп Макітра добра. Сябраваў са старэйшым за сябе аж на тры гады суседам Лёнькам. Той цэлымі днямі пасля ўрокаў брынкаў на трафейнай гітары. Вось Піліпок і навучыўся ў яго падбіраць акорды, а неўзабаве ўжо іграў лепш за Лёню.

Вайна закінула бацькоў Піліпа-Пола аж у Нямеччыну, а пасля вайны яны апынуліся ў Англіі. На бацькаўшчыну не вярнуліся. Амаль пяць гадоў Макітры змагаліся за вяртанне ім сына. Толькі з дапамогай Чэрчыля, які звярнуўся з гэтай нагоды да Молатава, дзевяцігадовы Піліпок атрымаў брытанскае грамадзянства, бацькоў і новае імя і прозвішча Пол Макартні.

Аднойчы, калі ў сямейным асяродку Леанід Данілавіч Кучма, прэзідэнт Украіны, расказаў зяцю, як ён вучыў граць на гітары самога Макартні, той не паверыў, аж пакуль не запрасіў сэра Пола выступіць з канцэртам у Кіеве на Майдане. Гэтую прапанову ўлюбёнец мільёнаў прыняў з вялікай радасцю і ўдзячнасцю.

Па матэрыялах украінскай прэсы падрыхтаваў У. ГУЛЕНКА.

Вы не паверыце

У ліпені ў Беларусі будзе выключна сонечнае надвор'е

Як стала вядома карэспандэнту «Звязды» з кампетэнтных крыніц, гэтымі днямі айчыннымі «кулібінымі» завяршаецца распрацоўка прынцыпова новага абсталявання па бескантактным уздзеянні на сярэдненасычаную воблачнасць.

Дзеля чаго патрэбна гэтае дзіўнае суперсучаснае абсталяванне? Справа ў тым, што ў Беларусі ў цёплы перыяд удзень не заўсёды працяглы час трымаецца сонечнае надвор'е. Больш за тое, невялікія дажджы ці нават моцныя ліўні ўзнікаюць на тэрыторыі краіны часам у зусім неспрыяльны для народнай гаспадаркі час.

Дык вось, новае абсталяванне канцэрна НСЭ будзе кантраляваць вільготнасць і ціск паветра над пэўнымі тэрыторыямі краіны. Суперсучасная айчынная апаратура разлічана на дзеянне ў двух рэжымах. Увечары абсталяванне стане нейкім чынам бескантактна сціскаць сярэдненасычаную воблачнасць, таму ўначы будзе запланавана ісці дождж. Удзень такая апаратура пераключаецца на другі рэжым і забяспечвае нам выключна сонечнае надвор'е. Першыя выпрабаванні перспектыўнага абсталявання плануецца правесці сёння на тэрыторыі Ляхавіцкага раёна на балоцістых мясцінах ракі Шчара. Ужо зараз мясцовыя рыбакі гэтага рэгіёна спадзяюцца, што новае абсталяванне значна палепшыць ім настрой.

Сяргей ПАЛІНІН.

АПОШНЯЕ ПАЛЯВАННЕ САКАВІКА

У апошнія дзянькі сакавіка паляўнічыя Шаркаўшчынскага раёна атрымалі сапраўдны падарунак. З начы выпаў снег. Егер Лужкоўскай паляўнічай дачы Віктар Паляк разам з калегамі абклалі шэсць ваўкоў. Зграя ваўкоў з восені турбавала вакольныя мясціны, і вось яна трапіла ў пастку. З'ехаліся паляўнічыя з Мёраў, Дзісны, Глыбокага, Шаркаўшчыны і нават з Полацка. Паставілі нумары і пусцілі загоншчыкаў. Хвіліны чакання — і вось першыя стрэлы. Праз дзве гадзіны ўсё было скончана. Упалявалі трох буйных ваўчыц. На жаль, мацёрыя ваўкі, параненыя, вырваліся з акладу. Пераследаваць было немагчыма, бо снег растаў...

Валерый КАВАЛЁНАК, жыхар Шаркаўшчыны, фотапаляўнічы. Фота аўтара.

Першакрасавіцкае

ЖАБА Ў БУЛЬБЕ ДЛЯ КАХАНАГА МУЖЧЫНЫ

НАРОДНЫ ансамбль «Чапурушкі» з аграгарадка Папоўка Слаўгарадскага раёна рыхтуе лепшыя жарты да 1 красавіка.

Нездарма гавораць, што гумар — гэта самая мяккая падушка паміж чалавекам і жыццём. З гумарам у «Чапурушак» усё ў парадку.

Усе жанчыны ў ансамблі — не проста сяброўкі, але і сваячкі. Кіруе «Чапурушкамі» Галіна Сяргееўна Малахоўская, культработнік з гучным голасам, агнявым характарам і актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Вельмі любіць жартаваць з мужчын, і таму адна з канцэртных праграм калектыву складаецца з «бабскай гаворкі пра любоў у маладосці»:

— Адна мужа ўспамінае: што за хлопец быў калісьці, а другая свайго лае — мне ж даў Бог за чорта выйсці!

Пры гэтым сама Галіна Сяргееўна лічыць свайго мужа лепшым у свеце, таму што без яго яна не мела б шанцаў справіцца з вялікай хатняй гаспадаркай і дзясяткам кароў.

— Безумоўна, трэба бачыць твары мужчын у зале, калі мы выконваем гэтыя прыпеўкі. Яны ўсміхаюцца, спадзяёмся, што шчыра. Бо насамрэч мужыкі ў нас добрыя. Беларускі гумар усім блізкі, і прыпеўкі пра мужоў — гэта яго неад'емная частка.

Музычны кіраўнік ансамбля — Алена Аляксандраўна Слаўнікава, кума Малахоўскай і настаўніца музыкі па прафесіі. Жанчына адразу прызналася, што самае вялікае ўражанне ад 1 красавіка звязана ўсё ж такі са школай: калі вучні для жарту пасадзілі пад падлогу ката, які жаласна крычаў, а даставаць яго ўрэшце давялося з дапамогай спецыяльнага інструмента і навучаных спраўляцца з экстрэмальнымі сітуацыямі людзей.

Галоўная салістка «Чапурушак» — Марына Алегаўна Макаранка, сястра кіраўніцы. Яна старэйшая ўдзельніца ансамблю і яго «залаты голас». Марына Алегаўна — вядомая прыпевачніца. «Каб не пела, не спявала, дык даўно б памерла!» — гэта яна пра сябе. Менавіта Галіне Алегаўне належыць самы арыгінальны першакрасавіцкі жарт у Васькавіцкім сельскім клубе, пра які «чапурушкі» расказваюць хорам:

— Садзімся за стол і падаём у гліняных гаршках запечаную бульбу з мясам — любімую страву нашых мужыкоў. Адкрывае адзін накрыўку, з лыжкай у руцэ і добрым настроем, а там замест ежы сядзіць жаба лупатая. Аказваецца, Алегаўна, калі перабірала бульбу, знайшла жабу і вырашыла пажартаваць. Трэба было гэта бачыць! Дзве пары вачэй насупраць: ён выпучыўся на жабу, а жаба — на яго!

Маладзейшыя ўдзельніцы «Чапурушак» на такія даволі жорсткія жарты яшчэ не асмельваюцца і мужоў шкадуюць. Адна дзяўчына ўдзячная, што яе каханы даглядае дваіх дзяцей, пакуль яна гастралюе па Магілёўскай вобласці. Іншая прыдумала мужа браць з сабой:

— Ведаеце, часам мужчыны супраць таго, каб жонка спявала ды танцавала ў ансамблі. Маўляў, няхай лепей у хаце сядзіць. Дык я знайшла выйсце: на мінулыя Каляды разам з мужам выступалі. Ён быў цыганам — вельмі прыгожым і ўрэшце вельмі задаволеным.

— І ніякая цыганка майго мужыка не адаб'е! — ваяўніча запэўнівае «чапурушка». — Калі што, дык нёба сабе падрапае...

Дарэчы, назва «Чапурушкі» ў ансамбля са слаўгарадскай глыбінкі з'явілася ад першай песні, якую жанчыны спявалі.

— Ёсць такая старая беларуская песня пра кабету, якой муж даў волю: «А ўсе людзі лён пасеялі, а мая чапурушка і не задумлівала...» Чапурушка ў нашым разуменні — гэта жанчына, якая ўмее даглядаць сябе, прыхарошвацца!

Умеюць прыхарошвацца і цярпяжнія «Чапурушкі». «Талерка залачона па століку вярцелася. Прыдумайце, вучоныя, каб есці не хацелася!» — гэта, пагадзіцеся, адвечная жаночая праблема.

Боты на высокай шнуроўцы — самая актуальная мода: «Шчыруй, Алегаўна на дыскатэку збіраецца!» Для ўсіх абавязковая — яркая чырвоная памада.

— Але самае галоўнае — настрой! Калі б мы не любілі жарты і песні, то як бы выглядалі? — рытарычна пытаецца аптымістычная Галіна Малахоўская. — Вы ж разумееце, што такое вёска: гаспадарка, хата, дзеці... Але калі выходзім на сцэну, то я кажу дзяўчатам: «Трэба, каб на нас было прыемна глядзець!» Таму наша візітная картка — шчырыя ўсмешкі і добры настрой!

Загадчыца Васькавіцкага сельскага клуба і вядомая ўдзельніца «Чапурушак» Марына Анатольеўна Самусенка запэўнівае, што жыць у вёсцы стала больш весела: у аграгарадок сталі часцей прывозіць канцэртныя праграмы, ды і мясцовыя артысты актыўнічаюць, асабліва ў старадаўніх абрадах і спевах. «Чапурушкі» і самі шануюць традыцыі: іх сімвал — бела-чырвоны ручнік 1813 года, які ткала прабабуля кіраўніцы ансамбля для бласлаўлення маладых на вяселлі.

— Жыць цяпер сапраўды стала лепей, — шчыра гаворыць Галіна Малахоўская. — У нас цяпер ёсць добры клуб, а раней мы збіраліся ў «прымыльніку» сельсавета. А цяпер ёсць месца для дзяцей і дарослых, каб разгарнуцца і бавіць вольны час. Цяпер, паверце, для тых, хто хоча на вёсцы жыць па-сапраўднаму, ёсць магчымасць. Тут галоўнае, як настроены сам чалавек, ці ёсць у яго жаданне працаваць і потым весяліцца.

«Чапурушкі» з Васькавіцкага сельскага клуба збяруцца ў Дзень жартаў не ў канцэртнай зале, а за сталом сямейнага клуба. Будуць смачна есці, спяваць і жартаваць. У «Васькавіцкіх прыпеўках» раскажуць, чым славіцца слаўгарадскі край: напрыклад, сваёй бульбай, якую тут называюць «валютай». Тутэйшыя гаспадыні паабяцаюць не сквапіцца і прапануюць гасцям дранікі, сала і пальцам пханую каўбасу. «Паясі — дык весялей спяваецца!»

Будзе гульня ў пярсцёнак і мужчынскі конкурс «па тонкім лёдзе», дзе трэба перакладаць паперы і па іх бегчы да прыза. Дарэчы, прыз перадаецца каханай жанчыне з прызнаннем. «Ведаеш, а я дасюль цябе кахаю!» — аднойчы пачула і адна з «Чапурушак». І гэта ўжо — акрамя жартаў.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.
Слаўгарадскі раён.

1 красавіка

Дзве даты

1557 год — прыняты «Статут на валокі», якім у Вялікім Княстве Літоўскім была ўнармавана зямельная рэформа, што праводзілася з канца XV стагоддзя. У адпаведнасці са Статутам, ставілася задача надзяліць кожную сялянскую сям'ю ўчасткам плошчай у 1 валоку (каля 21 га). Пры панскіх дварах ствараліся фальваркі (гаспадарчыя маёнткі).

1890 год — бельгійскі эмігрант Шарль ван Дэполь атрымаў у ЗША патэнт на першы тралейбус.

Цытата дня:

«Сябар, які дабіўся ўлады, — страчаны сябар».

Генры Брукс Адамс (1838—1918), амерыканскі гісторык.

ХАТНІ АБЯРЭГ

Венік быў абярэгам ад нячыстай сілы, калі яго паставіць каля дзвярэй хаты ці хлява, павярнуўшы «дагары нагамі» (г.зн. пруткамі ўгору), але добра ведалі: перавараочваць мятлу такім чынам у хаце — да галаўнога болю.
У дні, калі, як лічылася, вядзьмаркі злосна лютуюць, з венікам рабілі пэўныя дзеянні: чыталі замовы і абмахвалі жывёлу мяцёлкамі, падвешвалі венік у хляве, закопвалі ў парозе ці ўвогуле спальвалі.

- Венік шырока выкарыстоўвалі ў якасці абярэгу для парадзіхі і нованароджанага (яго маглі пакласці пад падушку ці пад калыску, пры галаве; часам два венікі ставілі крыж-накрыж). Для аховы ад злых духаў венік маглі пакласці пад падушку маладым.
- Ратуючы свой ураджай ад птушак, грызуноў і іншых шкоднікаў, «калядны» венік клалі ў снапы ці рассыпалі па прутку ў склепе ці ёўні. З той жа мэтай на Палессі з дзеркачом у руках абыходзілі поле па сонцы і мялі «ад сябе».
- Па народных павер'ях, кругавыя абходы з венікам у руках абараняюць жытло ці цэлы населены пункт ад рознага зла. У некаторых рэгіёнах існаваў звычай пры пажары абыходзіць са старым венікам палаючую хату.
- Лічылі, калі абмесці тройчы курніка і закапаць у ім гэту мятлу, то куры хварэць не будуць і іх не з'ядуць драпежныя звяры.
- Ад нападкаў чужых пчол на свае вуллі засцерагаліся трыма асінавымі каламі і венікам, кажучы: «Сядайце, чужыя пчолы, на асінавыя калы ды й на стары венік — і адсюль не адыходзьце!».
- Калі цяжка збівалася масла ці бляталіся ніткі ў аснове пры ткацтве, «пад работу» падкладалі стары венік.
- Каб добра пёкся хлеб, на прыпечку спальвалі некалькі пруткоў са старога веніка.
- Цэлы шэраг магічных дзеянняў з венікам ці яго пруткамі існаваў у народнай медыцыне. Напрыклад, дзевяць пруткоў са старога веніка падвешвалі ў галаве дзіцячай калыскі (ці зашывалі ў адзенне дзіцяці) ад сурокаў ці начных крыксаў; калі дзіця доўга не хадзіла, яго ставілі на венік, затым венік ссякалі, а пруткі раскідвалі; для лячэння радыкуліту секлі бярозавы венік на парозе ці на паясніцы хворага.
- Венік з асіны, выраблены ў Сілуянаў дзень (12 жніўня), можа пазбавіць вас ад сурокаў і застарэлых захворванняў.
- Ведалі: каб у хаце быў лад і дабрабыт, новай мятлой трэба крыху памесці ў хату, перш чым пачнеш месці з хаты.
- Стары, скарыстаны, зношаны венік знішчалі таксама незвычайна. Яго адносілі як мага далей ад хаты; кідалі ў раку; закідвалі на дах хаты; спальвалі на рытуальным вогнішчы (у Чысты чацвер; на Вялікдзень, на Юр'я альбо Купалу). Існавала забарона спальваць венік у сваёй печы. Гэта магло наклікаць моцны вецер ці прыцягнуць у хату сваркі і спрэчкі; таксама казалі, што ў такім выпадку можа трэснуць печ ці каршун з'есць птушанят.
- Венік выкарыстоўвалі як для спынення працяглых дажджоў, так і для таго, каб выклікаць дождж у час засухі. На Палессі, каб выклікаць дождж, у калодзеж кідалі сухі венік; на скрыжаванні дарог спальвалі 12 венікаў; абыходзілі з венікам вёску. Каб спыніць дождж, праз акно выкідалі венік і хлебную лапату ці закідвалі венік на дах.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

Двое на рыбалцы:

— Вася, ды не плюй ты так моцна на чарвяка! Ад яго п'яных размоў потым уся рыба ўцякае...

☺

— На каго вучышся?
— Эканоміка і кіраванне на транспарце!
— Так бы адразу і сказаў — на кандуктара.

☺

Адзін удар кулаком у вуха замяняе тры гадзіны выхаваўчай гутаркі.

☺

У гасцях.
— А чаго ў вас кот жоўты?
— Наогул ён белы, у нас проста дома кураць...

☺

Захад можа дараваць Кадафі тое, што ён — дыктатар і забойца, але тое, што ў Лівіі бензін па 14 цэнтаў за літр — гэта ўжо бязмежжа.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 1522. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12